Пролетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!
פּראָלעטאַריער פון אַלע לענדער, פאַרייניקט אייך!
Proletariusze wszystkich krajow, laczcie sei
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

ОРГАН ЦЭНТРАЛЬНАГА ВЫКАНАЎЧАГА КАМІТЭТУ САВЕТАЎ РАБОЧЫХ, СЯЛЯНСКІХ І ЧЫРВОНААРМЕЙСКІХ ДЭПУТАТАЎ І САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БЕЛАРУСКАЙ С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
6 чэрвеня 1931 г.
№ 128 (3216)

Ленина 81
Нач. библ-ке
-32г. /СБ.-I /

ПАДРЫХТОЎКУ ДА УБОРАЧНАЙ У ЦЭНТР УВАГІ

Надрукаваная ўчора ў нашай газэце пастанова ЦК КП(б)Б аб падрыхтоўцы і правядзеньні ўборачнай кампаніі павінна прыкаваць да сябе ўвагу ўсіх партыйных, камсамольскіх, савецкіх, прафесыянальных і калгаснакаапэрацыйных арганізацый, усіх рабочых калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў БССР..

Самым шпаркім тэмпам трэба скончыць сяўбу, і зараз-жа пераключыцца да падрыхтоўкі да ўборачнай кампаніі. Посьпехі калектывізацыі ў БССР, перавыкананьне кантрольнай лічбы калектывізацыі, вызначанай партыяй і ўрадам, гаворыць аб тым, што ў БССР ёсьць усе магчымасьці, усё неабходнае для таго, каб ў вясьнянною пасеўную кампанію выканаць кантрольную лічбу 45 проц. па калектывізацыі.

Уборачная кампанія гэтага году будзе праходзіць ва ўмовах новых і сур'ёзных дасягненьняў у барацьбе за суцэльную калектывізацыю і ліквідацыю на яе базе кулацтва як клясы. Уборачная кампанія будзе праходзіць пры значна большай насычанасьці сельскагаспадарчай вытворчасьці машыннай тэхнікай. Але з другога боку ўборачная кампанія будзе праходзіць ва ўмовах яшчэ больш жорсткай клясавай барацьбы, ва ўмовах шалёнага супраціўленьня апошняй капіталістычнай клясы нашай краіны—кулацтва, якое паспрабуе сарваць, затармазіць, пашкодзіць правядзеньню ўборачнай. Павялічэньне плошчы засеву гэтага году, асабліва плошчы тэхнічных і гародных культур, ушчыльненьне тэрмінаў уборкі, якое дыктуецца кліматычнымі ўмовамі гэтага году, абавязвае ўсе партыйныя, камсамольскія, савецкія, прафесыянальныя, гаспадарча- калгасныя арганізацыі, усіх рабочых і працоўных ужо зараз паставіць пытаньне аб падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі ў цэнтр сваёй увагі.

Вопыт правядзеньня веснавой сяўбы з асаблівай яснасьцю паказвае усё вялізарнае значэньне правільнай арганізацыі працы ў саўгасах і калгасах. Нездавальняючае, фармальнае правядзеньне зьдзельшчыны зьяўляецца асноўнай прычынай прарываў у веснавой пасеўнай кампаніі. Тыя саўгасы і калгасы, якія фармальна ўвялі ў сябе зьдзельшчыну, аснаваную на працаднёх, ці зусім яшчэ не ўвялі зьдзельшчыны, павінны зараз-жа і неадкладна ліквідаваць гэты важнейшы прарыў, бо гэта зьяўляецца асноўнай умовай для пасьпяховага правядзеньня ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да разьмеркаваньня ўраджаю.

Трэба ажыцьцёвіць поўнае і своячасовае правядзеньне даглядаў за пасевамі, якія вызначаны СНК і НКЗ БССР (поліва гародаў, кармавых кораньплодаў, лёну і канапель, баранаваньне, акучваньне бульбы, кораньплодаў), прыняўшы ўсе захады да правядзеньня агратэхнічных мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць падвышэньне колькасьці і якасьці ўраджаю.

Зараз-жа трэба дакладна ўлічыць колькасьць маючыхся ўборачных машын і інвэнтара, дакладна ўлічыць, якія дадатковыя патрэбы маюцца ва ўборачным інвэнтары, ужо зараз трэба арганізаваць і пусьціць на поўны ход майстэрні па рамонту сельскагаспадарчых уборачных машын і інвэнтара. Трэба зараз-жа распрацаваць календарны плян уборачнай кампаніі і давесьці яго да кожнага сельсавету, саўгасу, калгасу, МТС.

Асаблівую ўвагу трэба зьвярнуць на забясьпечаньне рабочай сілай саўгасаў і калгасаў у часе ўборачнай кампаніі. Вопыт мінулага году павінен быць улічаны такім чынам, каб упікнуць недахопаў у рабочай сіле. Саўгасы павінны зараз-жа ўзмацніць вярбоўку рабочай сілы, павінны фарсаваць заключэньне дагавораў аб узаемадапамозе з калгасамі. Калгасы павінны ў цэнтры сваёй увагі паставіць правільную арганізацыю працы, зьдзельшчыну, памятаючы, што зьдзельшчына і правільная пастаноўка вучоту зьяўляецца важнейшай умовай у вырашэньні праблемы аб забесьпячэньні рабочай сілай. Павінна быць шырока арганізавана ўзаемадапамога з боку саўгасаў і калгасаў аднаасобнікам машынамі і сельска-гаспадарчым інвэнтаром і наадварот рабочай сілай з боку беднякоў і сераднякоў—аднаасобнікаў калгасам і саўгасам. Рашуча змагаючыся з недаацэнкай жаночай працы ў часе падрыхтоўкі і правядзеньня ўборачнай, трэба арганізаваць спэцыяльныя жаночыя брыгады, што зьяўляецца важнейшым мерапрыемствам партыйных і калгасна-каапэрацыйных арганізацый. Уся праца павінна праводзіцца пры шырокім разгортваньні сацспаборніцтва і ўдарніцтва паміж раёнамі, асобнымі калгасамі і саўгасамі, брыгадамі.

Сенажаць—гэта першы этап уборачнай. Трэба прыняць усе захады для таго, каб ніводнага га сенажаці не засталося нескошаным. Трэба зараз-жа разгарнуць масавую кампанію за тое, каб правесьці ня менш двух укосаў заліўных сенажацяй. Вопыт мінулага году, калі не хапіла кармоў, павінен асаблівую ўвагу зьвярнуць ня толькі на поўнае выкананьне плянаў сенажаці, але і на тое, каб поўнасьцю выканаць плян сіласаваньня 1 млн. тон кармоў.

Адпаведныя арганізацыі павінны зараз-жа прыняць усе меры да своячасовага завозу і разьмеркаваньня ўборачных і малацільных машын, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на завоз лёнацерабілак, бульбакапалак, з запаснымі часткамі да іх, рашуча неадкладна рэалізаваць маючыяся залежы с.-г. уборачных машын і прыладаў, разам з узмацненьнем рамонту гэтых машын.

ЦК КП(б)Б прапануе Белкаапсаюзу і ЦСПСБ у дэкадны тэрмін распрацаваць канкрэтны плян практычнага ўдзелу прафсаюзаў у працы па правядзеньні падрыхтоўчай і ўборачнай кампаніі ў прагарадных гаспадарках. Кожнае прадпрыемства будзе прымацавана да асобных прыгарадных саўгасаў. Партыйныя і прафесыянальныя арганізацыі гэтых прымацаваных прадпрыемстваў павінны быць кроўна зацікаўлены як у даглядзе за гэтымі гаспадаркамі, так і ў актыўным удзеле ва ўборачнай кампаніі, памятаючы, што ад гэтага ў значнай меры залежыць палепшаньне рабочага забесьпячэньня.

Камсамол і пінэрарганізацыі абавязаны прыняць самы актыўны ўдзел у працы па дагляду пасеваў, у—правядзеньні ўборачнай кампаніі.

«Камсамол у паход на поліва, ўборку тэхнічных і працаёмных культур і выкананьне ня менш мільёнаў тон сіласных кармоў»—пад такім лёзунгам павінны ісьці камсамольскія і піянэрскія арганізацыі да ўборачнай кампаніі.

Уся падрыхтоўчая і ўборачная кампанія толькі тады пройдзе пасьпяхова, калі будзе зараз-жа разгорнута самая шырокая масавая работа, калі да гэтай кампаніі будзе зараз-жа прыкавана ўвага рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў аднаасобнікаў, калі масы будуць мабілізаваны на поўнае выкананьне ўборачных плянаў. Выразнае і пасьлядоўнае ажыцьцяўленьне генэральнай лініі партыі, бязьлітасная барацьба з кулацтвам і яго агентурай правымі і «левымі» апартуністамі, самая рашучая барацьба з усімі праявамі правага апартунізму на практыцы разам з разгортваньнем масавай работы забясьпечуць пасьпяховае правядзеньне пасеўнай кампаніі, зьвяцца рашаючым моментам у барацьбе за новы моцны прыліў у калгасы і дапамогуць па бальшавіцку падрыхтавацца да ўборачнай кампаніі.

МІЛЬЕНЫ ГАЛОДНЫХ У КАПІТАЛІСТЫЧНЫХ КРАІНАХ

штурмуюць магістраты, разьбіваюць спажывецкія крамы, паліцэйскія вучасткі, патрабуюць работы і хлеба

Баявыя дэманстрацыі беспрацоўных у Польшчы

ВІЛЬНЯ, 6-VI. «Газэта Варшаўска» паведамляе, што ў Загляміі Дамброўскім мясцовыя камуністы арганізавалі рад мітынгаў. На мітынгах прымала ўдзел шмат тысяч гарнякоў. Паліцэйскія атрады спрабавалі разагнаць мітынг, аднак гэта ім не ўдалося. Баявы настрой гарнякіх мас, іх рашучы адпор паліцыі прымусілі апошнюю адступіць.

Пасьля мітынгу рабочыя са сьцягам камуністычнай партыі наладзілі вялізарнейшую дэманстрацыю. Падасьпеўшыя новыя атрады паліцэйскіх некалькі разоў накіраваліся на дэманстрантаў, аднак кожны раз атрымлівалі рашучы адпор.

Баявая дэманстрацыя беспрацоўных адбывалася таксама ў Сасноўцы. Паліцэйскія атрады некалькі разоў нападалі на дэманстрантаў. Дэманстранты адбіваліся каменьнямі і сталёвымі радамі прайшлі ў цэнтр гораду. Тут быў наладжан мітынг, на які зноў нападалі атрады пешай і коннай паліцыі, прычым паліцыя для разгону дэманстрацыі ўжывала газавыя бомбы. Пасьля мітынгу паліцыя праводзіць масавыя аблавы і арышты западозраных у камуністычнай дзейнасьці.

У Лодзі больш 10 тысяч беспрацоўных з чырвоным сьцягам ішлі да біржы працы і патрабавалі зараз-жа выплаціць дапамогу. Бачачы рашучасьць і баявы настрой дэманстрантаў чыноўнікі біржы працы паабяцалі, што яны будуць хадайнічаць, але гэта не здаволіла беспрацоўных і яны дабіваліся, каб дапамога была выдана зараз-жа.

Падасьпеўшы атрад паліцыі абкружыў біржу працы, прычым ля варот і пад'ездаў былі пастаўлены кулямёты. Разам з тым паліцыя з газавымі бомбамі пачала разганяць беспрацоўных. У выніку бойкі шмат беспрацоўных па калечана шаблямі і шмат зьбіта прыкладамі і нагайкамі. Учынены шматлікія арышты. Арыштаваных 14 чалавек закуты і адвезены ў ахранку.

Віленскі друк паведамляе, што ў Вільні беспрацоўныя на працягу апошніх трох дзён штурмуюць будынак ваяводы, які ахоўваецца вялікім атрадам пешай і коннай паліцыі. Беспрацоўныя патрабуюць неадкладнай выдачы дапамогі, адзначаючы, што многія з іх таварышоў ужо ня могуць ха дзіць, папухлі з голаду. Паліцыя ўчыняе шматлікія арышты сярод беспрацоўных, аднак, гэта не дасягае мэты. Каля ваяводства ўдзень і ўночы неадступна сядзяць на вуліцы сотні беспрацоўных з сем'ямі.

„Стральцы" расстрэльваюць рабочых

ВІЛЬНЯ,6-VI. Польскі друк паведамляе, што ў Трэмешчне беспрацоўныя наладзілі дэманстрацыю з патрабаваньнем работы і хлеба. Вялікія атрады пешай і коннай паліцыі не змаглі разагнаць дэманстрантаў. На дапамогу паліцыі былі мабілізаваны атрады спрэльцаў, якія пачалі абстрэльваць натоўп беспрацоўных. Беспрацоўныя дружна абаранялісь каменьнем, прычым удалося абязброіць некалькі стрэльцаў. Бойка працягвалася звыш 5 гадзін, у выніку паранена цяжка 12 чалавек і больш 50 лёгка паранена.

Уночы прыбылі новыя атрады паліцыі, якія распачалі аблаву і масавыя арышты. Каля 40 рабочых арыштавана, закута па руках і нагах і адпраўлены ў аспрот. Трэмешчне нагадвае ваенны лягер. Па вуліцах разьяжджаюць паліцэйскія патрулі, пасьля 9 гадзін забаронен усякі рух.

Беспрацоўе павялічваецца

ВІЛЬНЯ, 6-VI. Газэта «Работнік» паведамляе, што на капальні «Бялы Шары» ў Бразінах звольнена 720 гарнякоў. А таксама праводзіцца далейшая рэдукцыя (звальненьне) па ўсім Гурным Шлёнску.

Пятля Юнга заціскаецца

Новы цяжар на плечы працоўных мас Нямеччыны

БЭРЛІН, 6. Агенцтва Вольфа паведамляе, што Гінцэрбург падпісаў новы надзвычайны дэкрэт прадугледжваючы рад мерапрыемстваў для аднаўленьня раўнавагі дзяржаўнага бюджэта, дэфіцыт якога складае ў сучасны момант 940 млн. марак. Будуць скарочаны ад 3 да 8 проц. аклады, пэнсіі і іншыя даходы ўсіх служачых дзяржаўных і камунальных устаноў. Будзе ўведзен, так званы крызісны падатак, які будуць плаціць усе, хто атрымлівае зарплату, г. зн. усе працоўныя. Гэты падатак будзе складаць да 9 проц. даходу. Дапамога беспрацоўным будзе скарочана.

Апрача таго, будуць зьмешчаны ўсе выдаткі зьвязаныя з беспрацоўем. Дэкрэт далей прадугледжвае ўвядзеньне 40 гадзіннага працоўнага тыдню з ад наведным зьніжэньнем зарплаты. Будзе таксама ўстаноўлен цукровы падатак.

Голад шырокіх мас працоўных Нямеччыны

Беспрацоўныя штурмуюць магістраты

БЭРЛІН. Амаль ва ўсіх гарадох Рурскай вобласьці ўчора 5 чэрвеня зноў адбыліся дэманстрацыі і выступленьні на грунце голаду. Моцнае абвінчэньне народных мас зараз носіць больш рэзкі характар, чым нават у зімовыя месяцы. Паводле паведамленьняў агенцтва Рэйтэр, у Эсэне, Дуізбургу, Хаме, Нэйкельне і радзе іншых гарадоў Рурскай вобласьці адбыліся дэманстрацыі.

Дэманстранты разбурылі брук і закідалі паліцыю градам каменьня. Вулічнае асьвятленьне часткова зьнішчана. Паліцыя адказвала шалёнай стральбінай па натоўпу. У Ване-Эйхе шмат дэманстрантаў ранена. На Ніжня-Рэйнскім мэталюргічным заводзе аб вешчана забастоўка, якая працягвае ца ўжо 3 дні. У Бахольце і Дуісбургу бастуюць рабочыя грамадзкіх работ і тэксыльшчыкі.

Палягчэньне рабочым... зарплаты

Мал. маст. Я. КАШКЕЛЯ.

Актыўная самаабарона бастуючых

ПАРЫЖ, 4-VI. Як паведамляе агенцтва Гавас з Мадрыду, міністр унутраных спраў заявіў, што «ў раёне Авіеда сутычкі паміж бастуючымі гарнякамі і паліцыяй справаджаліся перастрэлкай. Забастоўшчыкі сустрэлі стрэламі адпраўленыя для ўціхамірваньня ўзброеныя сілы»

Новы бэльгійскі габінэт

ПАРЫЖ, 5-VI. Агенцтва Гавас паведамляе з Брусэля аб фармаваньні новага бэльгійскага габінэту. Прэм'ер і міністр унутраных спраў Рэйнкін (каталіцкая партыя), з 12 міністраў новага ўраду—7 належаць да каталіцкай партыі і 5 да лібэральнай.

Супроць дэманстрацый беспрацоўных выкліканы вайсковыя часьці

НЬЮ-ЁРК, 5-VI. Паводле паведамленьня з Лімы (Пэру), перад будынкам двара прэзыдэнта адбылася дэманстрацыя рабочых і студэнтаў, патрабаваўшых вызваленьня палітзьняволеных. Войска атакавала дэманстрантаў. У час сутычкі паранена шмат рабочых. Сярод салдат паранена—6.

Напад паліцыі на беспрацоўных

БЭРЛІН, 6-VI. Напярэдадні апублікаваньня надзвычайнага дэкрэту ўраду Брунінга, бэрлінская паліцыя па загаду начальніка паліцыі сацыялдэмакрата Гржэзінскага, учыніла наскок на цэнтральную біржу працы ў Бэрліне Тысячы беспрацоўных, у тым ліку і жанчын, падпалі асабістаму вобыску.

Рабочыя не дазваляюць узводзіць паклёп на СССР

ЛЁНДАН, 30-V. Прыхільнікі Мосьлі, члены так званай «новай партыі» спрабавалі арганізаваць рабочы мітынг пад адкрытым небам у Лёндане. Аўдыторыя, аднак, была настолькі варожай выступаўшым фашыстам, што арганізатары вымушаны былі, на патрабаваньні рабочых даць слова рэвалюцыйнаму рабочаму, які падрабязна раструмачыў фашыцкі характар і сапраўдныя мэты «новай партыі».

Калі ўсьлед затым адзін з прамоўцаў «новай партыі» адважыўся выступіць супроць Савецкага саюзу са звычайнымі паклёпніцкімі абвінавачаньнямі, рабочыя зьнесьлі трыбуну і спынілі мітынг са сьцягамі Інтэрнацыяналу і «Чырвонага сьцягу». Фашысты прымушаны былі зьвярнуцца за абаронай да паліцыі.

СУСТРЭЦЬ ГАРОДНІНУ ПАДРЫХТАВАНЫМІ

Каапэрацыйныя арганізацыі яшчэ не павярнуліся тварам да выкананьня партыйных дырэктыў

Падрыхтоўка да ўборкі і пераапрацоўкі гародніны—першы экзамен для спажыўкаапэрацыі, першая праверка яе перабудовы ў адпаведнасьці з апошнімі дырэктывамі партыі і ўраду

Сяўба ў прыгарадных гаспадарках Віцебскага ЦРК зрываецца

Прыгарадныя гаспадаркі Віцебшчыны маюць ганебныя прарывы па выкананьні другой бальшавіцкай вясны. У той час, калі ёсьць пастанова партыйных і савецкіх арганізацый аб сканчэньні сяўбы да 1-га чэрвеня, па прыгарадных гаспадарках на 28-ае мая плян выкананы толькі на 30 проц.

У чым галоўныя прычыны зрыву сяўбы? Дырэктары саўгасу не нясуць непасрэдна ніякай адказнасьці, дзякуючы няправільнай пастаноўцы работы з боку с.-г. аддзелу ЦРК. Да апошняга часу зьдзельшчына была прынята толькі фармальна, а ў саўгасах нават адсутнічалі нормы запрацоўкі, якія знаходзіліся ў с.-г. аддзеле ЦРК. Поўнае адсутнічаньне ўдарніцтва і сацспаборніцтва, што гаворыць аб тым, што кіраўнікі гаспадарак недаацэньваюць сацыялістычны мэтад працы. У гаспадарках існуе безгаспадарчасьць. Да гэтага часу яшчэ няма растаноўкі культур на тэрмін сяўбы, адсутнічае плянавасьць у рабоце гаспадарак. Адсутнічае вучот працы. Транспарт, дадзены зімою, не скарыстоўваўся як належыць, а цяпер толькі возіць гной у гаспадаркі.

Галоўнай прычынай зрыву сяўбы зьяўляецца мінімальнае скарыстаньне як належыць рабочую і цягавую сілу. Пасланыя падшэфнымі прадпрыемствамі рабочыя брыгады на дапамогу сяўбе не скарыстоўваюцца, дзякуючы мінімальнаму кіраўніцтву гаспадарак растаўіць рабочую сілу. У гаспадарку «Білево» было накіравана шэфскімі арганізацыямі 150 чалавек, з іх гаспадаркай было прынята толькі 20 чалавек, а астатнія 130 былі зьвернуты. Гаспадарка «Парыская камуна» патрабавала 345 чалавек, але да прыёму іх не падрыхтавалася. Трэба адзначыць, што з боку некаторых фабкомаў таксама маюцца нядбайныя адносіны да прыгарадных гаспадарак, недаацэнка ўсёй важнасьці пасьпяховага правядзеньня сяўбы. Так, напрыклад, фабком ф-кі «Дзьвіна» адмовіўся дапамагчы прыгарадным гаспадаркам; таксама нядбайныя адносіны з боку заўкому Лесазаводу № 13.

Неабходна адпаведным арганізацыям прыняць належныя меры ўзьдзейнічаньня на арганізацыі, недаацэньваючыя важнасьць пасьпяховага правядзеньня бальшавіцкай вясны. Гаспадаркі павінны своячасова даць зьвесткі аб колькасьці патрэбных людзей у кожнай гаспадарцы.

Маючыяся трактары скарыстоўваюцца ня больш, як на 40 проц, і да іх адносяцца нядбайна. З боку некаторых прадпрыемстваў маецца невыкананьне пастановы дзяржаўнай пяцёркі па накіраваньні ў гаспадаркі коняй, на што неабходна зараз-жа рэагаваць, забясьпечыўшы патрэбнай колькасьцю гаспадаркі цягавай сілай.

С.-г. аддзел Цэрабкопу аб падрыхтоўцы да ўборачнай зусім ня рыхтуецца і да сёньняшняга дня яшчэ нямa пляну правядзеньня ўборачнай. Яшчэ ня рыхтуюць памяшканьне для ўборкі, таксама не рамантуюць неабходныя машыны.

Брыгада «Савецкай Беларусі»
С. Міркін і Н. Дварсон.

Войтаў зрывае кантрактацыю гародніны

Чэрыкаўскі райкаапсаюз вельмі непаворотлівы ў сваёй рабоце. Райкаапсаюз, на чале якога стаіць член партыі т. Войтаў, мае завінавачанасьць 75.000 руб., за што банк наклаў арышт на ўсю маёмасьць РКС. Такім чынам, с.-г. машыны ляжаць і райкаапсаюз ня можа іх прадаць.

Райкаапсаюз мае прарыў па ўсіх відах загатовак: па бульбе, лёне, і інш. Тав. Войтаў лічыць, што «леташняя 100-процантная калектывізацыя раёну ўгробіла райкаапсаюз. Трактарную калёну трэба разагнаць безадкладна, бо яна прынесла страты дзяржаве, трактары яе прадаць калгасам, а майстэрню перадаць саўгасу; толькі гэта выратуе мой лімэт».

Т. Войтаў ня даў райспажыўсаюзу цьвікоў забіць 40 скрынак загатоўленых яек для адпраўкі, сказаўшы: «у мяне будаўніцтва па калгасах начынаецца зрыву, а да вашых яек, мне няма справы».

У гэтага Войтава плян кантрактацыі: ўсіх відаў гародніны ня выкананы, а да кантрактацыі садоў не прыступлена зусім. Войтаў усім пахваляецца, што ён загадзіўся-б добраахвотна алсядзець год у спраўдоме, каб толькі не працаваць у райкаапсаюзе.

Ці доўга будзе традоўжацца дыскрэдытацыя партыі тав. Войтавым?

Аксенчык.

Вінаватых—да адказнасьці

Случак. (Ніж кар.). Случкая прыгарадная гаспадарка мае ў сваім карыстаньні 360 га пахатнай зямлі.

Здаецца, трэба было-б з усёй бальшавіцкай энэргіяй ўзяцца за засеў паказнай плошчы, шырока плянуюючы значэньне прыгарадной гаспадаркі сяроз рабочых гораду.

Але на вялікі жаль нічога гэтага зроблена ня было. У выніку чаго пасеў ідзе надта марудна.

Галоўнейшай перашкодай зьяўляецца недахоп гною.

Між тым, ня так даўно, на двары сталоўкі № 1 было шмат гною, якога ня было куды дзявацъ.

Загадчыкам сталоўкі ня раз ставілася пытаньне перад Гарспажыўтаварыствам і Райсаюзам аб тым, каб зьбралі гной. Неабходна было ачысьціць двор. Але ўвагі ніхто не зьвяртаў. Гарпоўцы сваімі злачынными адносінамі давялі да таго, што гной быў адданы прыватнікам.

Ужо засеяная гародніна патрабуе неадкладнага поліва, інакш усё загіне—вялікая праца і сродкі вылящуць у трубу».

Загадчыкам гаспадаркі ўжо ставілася пытаньне аб гэтым, але... яго патрабаваньні да Гарспажыўтаварыства аказаліся пустым гукам.

Рабочых не хапае. Неабходна зараз-жа паставіць пытаньне перад рабочымі прадпрыемстваў і служачымі аб аказаньні прыгарадной гаспадарцы дапамогі, а вінаватых у безадказнасьці і нядбайнасьці—прыцягнуць да суровай адказнасьці.

Ал. Курдо.

Гародніну—у цэнтр увагі

СТВОРАНЫ ЦЭНТРАЛЬНЫ ШТАБ КАНТРОЛЮ ЗА ПАДРЫХТОЎКАЙ ДА СУСТРЭЧЫ ГАРОДНІНЫ

Гэтымі днямі адбылася нарада пры газэтах «Рабочий» з удзелам газэты «Савецкая Беларусь» па пытаньні аб падрыхтоўцы ўборкі ў прыгарадных гаспадарках. У нарадзе ўдзельнічалі прадстаўнікі БКС, МЦРК, пракуратуры і інш. арганізацый.

З дакладу Белкаапсаюзу відаць, што па БССР павінна хавацца 80.100 тон гародніны, а хавальнікаў ёсьць толькі на 25.000 тон. Перавезьці па БССР трэба 200.000 тон, мяхоў трэба 75.000, а ёсьць толькі 15.000. З патрэбнай колькасьці тары ёсьць толькі 30 проц., трэба загатовіць 8.000 тон яблык, а скрынак ёсьць на адну чацьвёртую частку, з патрэбных 85.000 бочак для агуркоў ёсьць 30.000. Няма зусім цьвікоў для ўпакоўкі. Вось чаму трэба зьвярнуць увагу на абвешчаны двухдзядзілк тары.

У вельмі дрэнным становішчы знаходзіцца засолачныя пункты, гародніна-хавальнікі. Такія факты ёсьць у Лошыцы, Саўжанах, на чыгунцы, дзе засолачныя пункты знаходзяцца ў вельмі дрэнным становішчы: плесень, бруд, не праветрываецца памяшканьне. А ў ЦРК на гэта адказваюць: «яшчэ хопіць часу. Пасьнеем трывесьці ў парадак хавальнікі для гародніны»... Ці пасьнеце, таварышы з ЦРК?

Яшчэ дагэтуль МЦРК і БКС паміж сабой спрачаюцца, а нічога пакуль ня робяць. Адзін ківае на другога, і ніхто пакуль ня цікавіцца падрыхтоўкай да сустрэчы гародніны. БКС кажа, што яго справа—толькі адгрузіць, а далей—хай хоць гніе гародніна...

Трэба давесьці да ведама рабочых гэтае становішча, каб рабочыя самі ўзяліся за зажаску капусты і інш. гародніны. Трэба таксама зараз паставіць пытаньне аб тым, каб кожны жакт сам у сябе знайшоў памяшканьне для захаваньня гародніны сваіх жыхароў. Неабходна перад сталовымі паставіць пытаньне аб тым, каб яны адразу забралі адпушчаную ім колькасьць гародніны і хавалі ў сябе.

Трэба адзначыць, што Белсадгародніна і Саюзтара горш за ўсе арганізацыі цікавяцца гэтымі пытаньнямі. Тут патрэбна мабілізацыя ўсёй пралетарскай грамадзкасьці, каб падштырхнуць работу гэтых арганізацый.

Па лініі МЦРК патрэбна загатовіць 45.000 тон бульбы, 30.000 тон гародніны. Хавальнікаў трэба на 250 вагонаў. Патрэбна 25.000 мяхоў для перавозкі гародніны. Вось чаму трэба правесьці адпаведную работу ў вёсцы, каб там дастаць частку мяхоў. Бочак патрэбна 30.000, а ёсьць 10.000. Маркуецца загатовіць 300.000 тон капусты, для чаго трэба 250 чанаў. У зьвязку з гэтым ставіцца пытань не аб неабходнасьці пабудовы вузкакалейкі да чыгункі да буйных хавальнікаў, тым самым з'эканоміць іншыя віды транспарту, каштаваць гэта будзе 11.000 руб.

У зьвязку з гэтым, важна зазначыць на рад недахопаў у рабоце каапэрацыі, якія трэба лічыць за простае галавацяпства. Белсадсаюз забараніў Лагойскай каапэрацыі заключаць умовы з МЦРК. Або яшчэ горш: існуюць сустрэчныя перавозкі—бульбу возяць з Віцебску ў Магілеў, а з Магілеву—ў Віцебск.

БКС пасылае ўсім райспажыўсаюзам 25 мая паведамленьне аб тым, каб яны не лазьней 5 мая далі адказ на рад запытаньняў па будаўніцтву, якіх ім ня будуць адпушчаны крэдыты. Усе гэтыя паведамленьні пасланы ня ў прызначаныя раёны, а ў адзін...

ЦРК патрэбна 70 катлоў, а іх яшчэ няма, хаця БКС абяцаў іх даць. МЦРК БКС не адпускае некалькі сот рублёў для сканчэньня работ на сушылачнай базе МЦРК і з-за гэтага прыходзіцца за кілёмэтр вазіць ваду... Засолачных пунктаў таксама няма.

Яшчэ горш. Існуе такое становішча ў ЦРК: кіраўнікі двух аддзелаў МЦРК, якія сядзяць у адным пакоі, ніяк ня могуць дагаварыцца і адзін адмяняе распараджэньне другога, уносячы такім чынам блытаніцу ў рабоце.

Асабліва дрэннае становішча ў Белсадгародніне, якая ня мае дагэтуль ніякіх плянаў па гародніне. Вось чаму з ёю не заключаны дагэтуль дагаворы на перавозкі.

Цікавым малюнкам зьяўляецца наступны факт: у Белсадгародніне ёсьць праект засыпкі возера каля фабрыкі «Везувій» ў той час, як фабрыкай, наадварот, мяркуецца гэтае возера паглыбіць, бо яно мае для фабрыкі вялікае значэньне.

***

На гэтай нарадзе вылучаны цэнтральны штаб у ліку 10 чал. У гэты штаб увайшлі: прадстаўнікі ад газэт «Рабочий» і «Савецкая Беларусь», пракуратуры, БКС, Белсадгародніны, Наркамснабу, ЦСПСБ, МЦРК, санітарнага інстытуту і абутковай фабрыкі. Гэты штаб будзе сачыць за ходам усіх работ па забесьпячэньні рабочых гародніной.

Л. Пал.

Дапамога пацярпеўшым ад паводкі ў БССР

Пастанова Савету Народных Камісараў БССР

пра разьмеркаваньне сродкаў, асыгнаваных урадам СССР на дапамогу пацярпеўшым ад вясновай паводкі

Савет Народных Камісараў пастанаўляе:

1. Разьмеркаваць асыгнаваныя Ўрадам СССР 5 млн. рублёў на дапамогу пацярпеўшым ад вясновай паводкі наступным чынам:

а) для прамысловасьці вылучыць 1.100 тыс. руб., з іх: рэспубліканскай прамысловасьці ВСНГ—800 тыс. руб., прамысловасьці НК Снабжэньня—150 тыс. руб. і прамысловасьці саўгасаў—150 тыс. руб.;

б) асыгнаваць у распараджэньне раённых выканаўчых камітэтаў і гарадзкіх саветаў на аднаўленьне разбуранай гаспадаркі раёнаў, на аказаньне дапамогі абагуленаму сэктару сельскай гаспадаркі, а таксама і бядняцка серадняцкаму насельніцтву—2.400 т. рублёў;

в) на аднаўленьне жыльлёвага фонду ў Менску, Віцебску, Гомлі, Магілеве, Воршы, Барысаве і Полацку і на аднаўленьне камунальнай гаспадаркі, пабудоў і рабочых жыляшч у Менску, Віцебску, Гомлі і Барысаве вылучыць 1 млн. рублёў;

г) вылучыць 100 тыс. рублёў спажывецкай каапэрацыі на аднаўленьне страт, якія яна мела;

д) на аднаўленьне дарог і мастоў па лініі Галоўдартрансу вылучыць 400 т. рублёў;

2. Даручыць НК Фінансаў разьмеркаваць па раёнах вызначаныя 2.400 т. р., выходзячы з ступені разбуранасьці гаспадаркі раёнаў ад паводкі, вылучыўшы Дрысенскі раён, як найбольш пацярпеўшы ад паводкі, а таксама зьвярнуўшы ўвагу на камуну БВА, і зробленае разьмеркаваньне сродкаў па раёнах падаць на зацьверджаньне Савету Народных Камісараў.

Даручыць тав. Хацкевічу устанавіць асноўныя адзнакі для дапамогі пацярпеўшаму ад паводкі бядняцка-серадняцкаму насельніцтву.

3. Абавязаць НК Фінансаў даць паказаньні раёнам аб скарыстаньні адпушчаных сродкаў і аб падачы імі справаздачнасьці па скарыстаньні гэтых сродкаў.

Абавязаць установы і арганізацыі, якія атрымаюць сродкі на дапамогу ў сувязі з паводкаю, падаць у НК Фінансаў справаздачу аб іх выкарыстаньні.

4. Лічыць дапамогу, выданую пацярпеўшым ад паводкі установам і працоўнаму насельніцтву, безваротнаю дапамогаю.

Старшыня Савету Народных Камісараў БССР ГАЛАДЗЕД.
Кіраўнік Спраў Савету Народных Камісараў і Эканомсавету БССР С. КАНДЫБОВІЧ.
8 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

Плян 2-ой пяцігодкі-у парадак дню

„Чырвонай Зьмены" заклік прынят

Выклікаем „Зьвязду" „Акцябр" і „Орку"

У падрыхтоўку да складаньня генэральнага пляну другой пяцігодкі ўлілася чаецца магутная энэргія шматмільённых рабочых калгасных і бядняцка-серадняцкіх мас Савецкага Саюзу. Рабочыя, калгасьнікі, беднякі і сераднякі пад кіраўніцтвам ленінскай партыі ідуць пераможным крокам па шляху да канчатковай перамогі сацыялізму.

Баявы лёзунг—«ПЯЦЬ У ЧАТЫРЫ ГАДЫ»—выконваецца і перавыконваецца. Па паасобных галінах прамысловасьці пяцігодка выканана ў два з паловай гады. Першая пяцігодка будзе скончана ў канцы 1932 году. Таму зараз ва ўсёй шырыні паўстае пытаньне АБ ПАДРЫХТОЎЦЫ ДА СКЛАДАНЬНЯ ГЕНЭРАЛЬНАГА ПЛЯНУ ДРУГОЙ ПЯЦІГОДКІ.

На долю друку ў гэтай справе прыпадае вялізарнейшая частка работы. Зусім правільна зрабіла «ЧЫРВОНАЯ ЗЬМЕНА» калі яна ўключылася ў пад рыхтоўку матар'ялаў для складаньня генэральнага пляну і зьвярнулася з прапановай да ўсяго друку Савецкай Беларусі прыняць у гэтай справе непасрэдны і найактыўнейшы ўдзел.

Газэта «САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ» прымае выклік «Чырвонай Зьмены» і бярэ на сябе абавязак арганізаваць шырокія масы рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і сераднякоў, культармейцаў, ударнікаў культфронту, рабселькораў для падрыхтоўкі матар'ялаў па складаньні плянаў культурнай пяцігодкі БССР.

Мы з свайго боку заклікаем прыняць удзел у падрыхтоўцы матар'ялаў для другой пяцігодкі: «ЗЬВЯЗДУ»—па мэталёапрацоўчай, паліграфічнай і паперовай вытворчасьці; «АКЦЯБР»—па швэйнай і тэкстыльнай вытворчасьці; «ОРКУ»—па шкляной вытворчасьці.

Падрыхтоўка да складаньня пляну другой пяцігодкі павінна быць пераключана на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. У арганізацыі сацспаборніцтва і ўдарніцтва на лепшы ўдзел у складаньні генэральнага пляну другой пяцігодкі пралетарскі друк павінен быць у першых радох.

РАБОТУ „ЧЫРВОНАГА КРЫЖУ“ — НА СЛУЖБУ САЦЫЯЛІСТЫЧНАМУ БУДАЎНІЦТВУ

Узмацніць работу па правядзеньні справаздачнай перавыбарчай кампаніі бюро ячэек Чырвонага Крыжу

Узмацніць тэмпы работы

па правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі чырвонакрыжных організацый

Праведзенае ў красавіку месяцы буксірнымі брыгадамі Чырвонага Крыжу РСФСР і УССР абсьледваньне работы арганізацый Чырвонага Крыжу па 42 раёнах БССР паказала, што арганізацыя Чырвонага Крыжу БССР яшчэ не перабудавалі сваю работу ад наведна агульным тэмпам разьвіцьця сацыялістычнага будаўніцтва. У большасьці абсьледваных раёнах арганізацыі Чырвонага Крыжу лічыліся толькі на паперы і амаль зусім не працавалі, у лепшых выпадках абмяжоўваліся толькі зборам членскіх узносаў. Раённыя кіруючыя арганізацыі часта недаацэньваюць ролю грамадзкіх арганізацый і не дапамагаюць ім у арганізацыі шырокіх працоўных мас на выкананьне адказных задач трэцяга рашаючага году пяцігодкі.

Асабліва недаацэньваецца роля Чырвонага Крыжу, як грамадзкай арганізацыі, якая набывае вельмі важнае значэньне як абаронная арганізацыя. Есьць выпадкі, калі РК КП(б)Б і РВК нават ня ведаюць, што ў іх існуе такая арганізацыя, або проста ня прымаюць ніякіх захадаў да ажыўленьня яе работы.

Кіруючыя арганізацыі спасылаюцца на тое, што ім зараз няма часу займацца Чырвоным Крыжам і наогул грамадзкімі арганізацыямі, бо зараз праводзіцца пасеўная кампанія, загатоўкі і інш. баявыя кампаніі, але-ж яны забываюць ,што Т-ва Чырвонага Крыжу гэтымі пытаньнямі таксама займаецца, а калі не, дык іх трэба ўцягнуць у гэтую работу.

Зараз распачалася кампанія перавыбараў бюро ячэек Чырвонага Крыжу. Гэтая кампанія зараз набывае асаблівае значэньне ў тым сэнсе, што яна павінна ўзварушыць работу Чырвонакрыжных арганізацый.

Аднак ,ня гледзячы на ўсю важнасьць і адказнасьць задач, пастаўленых перад Чырвонакрыжнымі арганізацыямі, работа па правядзеньні перабыўчай кампаніі праходзіць вельмі марудным тэмпамі. Партыйныя ячэйкі і прафэсыянальныя арганізацыі месц на правядзеньне перавыбарчай кампаніі бюро ячэек Чырвонага Крыжу зварочваюць зусім мала ўвагі, ды і самі Чырвонакрыжныя арганізацыі яшчэ недастаткова ўдзяляюць увагі гэтай кампаніі.

Ня гледзячы на тое, што паводле пляну перавыбарчая кампанія павінна скончыцца да 25 чэрвеня, ня мясцох як відаць, да гэтай работы яшчэ ня прыступлена. Нават нямкіх зьвестак ад ходзе перавыбарчай кампаніі ні адзін раённы камітэт Чырвонага Крыжу ня прыслаў. Слабы ход перавыбарчай кампаніі канстатаваў і ЦК Чырвонага Крыжу БССР які разглядаў гэтае пытаньне і намеціў рад мерапрыемстваў па ўзмацненьні гэтай работы.

Усё гэта патрабуе рашучага ўзмацненьня тэмпаў работы па правядзеньні справаздачна-перавыбарчай кампаніі арганізацый Чырвонага Крыжу.

Ня трэба забываць і на тое, што Чрвоны Крыж зьяўляецца адным з ву частыкаў абароны краіны, а ў часе розных эпідэмій ён праводзіць значную работу па ліквідацыі іх. Таму на работу чырвонакрыжных арганізацый трэба зьвярнуць асаблівую ўвагу.

Усё гэта патрабуе ад мясцовых партыйных прафэсыянальных і грамадзкіх арганізацый актыўнага ўдзелу і дапамогі ва ўзьняцьці работы арганізацый Чырвонага Крыжу і дапамогі ім у правядзеньня справаздачна-перавыбарчай кампаніі.

Г.

Чырвоны Крыж на дарожным будаўніцтве

Улічваючы важнасьць дарожнага будаўніцтва ЦК Чырвонага Крыжу БССР прапанаваў усім арганізацыям Чырвонага Крыжу БССР прыняць актыўны ўдзел у гэтай справе.

Канкрэтная работа арганізацый Чырвонага Крыжу ў галіне дарожнага будаўніцтва павінна выражацца ў прыняцьці санітарна-тігіенічнага шэфства над асобнымі дыстанцыямі дарожнага будаўніцтва, нават над асобнымі кілёмэтрамі шляху, з мэтай стварэньня найлепшых умоў для работнікаў дарожнага будаўніцтва ў выкананьні паставленых перад імі задач.

Раённыя Камітэты і ячэйкі Чырвонага Крыжу на мясцох павінны праявіць ініцыятыву сумесна з іншымі грамадзкімі арганізацыямі па стварэньні штабаў на маб'лізацыі ўсіх сіл на дапамогу выкананьню задач дарожнага будаўніцтва з абавязковым уваходам прадстаўніка Чырвонага Крыжу ў гэтыя штабы.

На мясцох павінны быць арганізаваны стальныя пункты першай дапамогі з сясьцёр і дружын, аптэчкі хуткай дапамогі з дзяжурствам асоб, скончыўшых гурткі першай дапамогі.

Разам з гэтымі арганізацыямі Чырвонага Крыжу павінны павесьці шырокую растлумачальную работу сярод рабочых дарожнага будаўніцтва па ўцягненьні іх у ячэйкі Чырвонага Крыжу і гурткі першай дапамогі.

У правядзеньні ўсёй работы арганізацыі Чырвонага Крыжу павінны шырока разгарнуць сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва, мабілізаваць увагу членаў ячэек Чырвонага Крыжу па арганізацыі суботнікаў для падвозу каменьня і іншых матар'ялаў для дарожнага будаўніцтва.

Правядзеньне гэтых мерапрыемстваў дасьць магчымасьць арганізацыям Чырвонага Крыжу значна дапамагчы мясцом у выкананьні пляну дарожнага будаўніцтва. Мясцовым арганізацыям трэба ўлічыць магчымасьці дапамогі з боку Чырвонага Крыжу і прыняць усе захады да ўцягненьня арганізацый Чырвонага Крыжу ў работу па дарожным будаўніцтве.

Борц.

ЛІКВІДАВАЦЬ САМАЦЁК

у рэалізацыі білетаў лётарэі Чырвонага Крыжу і Чырвонага паўмесяца

Зараз праводзіцца 1-ая Усесаюзная лётарэя Чырвонага крыжу і Чырвонага паўмесяца. Гэтая лётарэя з дазволу ўраду СССР выпушчана на суму 10.000.000 руб. лётарэйнымі білетамі каштоўнасьцю 50 кап. кожны.

Увесь даход ад лётарэі паступіць на ўзмацненьне санітарнай абароны краіны і санітарнай культуры працоўных СССР. У лётарэі будзе разыгрывацца вялікая колькасьць каштоўных рэчаў, на агульную суму 1.500.000 руб. Паміж іншымі рэчамі будуць разыграны легкавыя аўтамабілі,матацыклы, племянныя коні і каровы, месцы ў санаторыі, паездкі заграніцу і па СССР, тэкстыльныя тавары і інш. Кожны з выгрышаў можа быць заменяны трашыма па каштоўнасьці тае ці іншае рэчы.

Усяго будзе 8 тыражоў, з якіх 2-гі па чарзе адбудзецца ў г. Менску ў кастрычніку г. г.

Ад лётарэйнага камітэту Выканкому Чырвонага крыжу і Чырвонага паўмесяца для БССР ужо атрымана 50 проц. намечаных да рэалізацыі лётарэйных білетаў.

Дзяржбанк сваячасова даслаў білеты камітэтам Чырвонага крыжу, але, на вялікі жаль, некаторыя камітэты атрымаўшы білеты вельмі марудна іх рэалізуюць. ЦК Чырвонага крыжу ня ведае, як ідзе рэалізацыя, бо вестак ніводзін камітэт яшчэ ня даў. На таварыства Чырвонага крыжу ўскладзены абавязак мабілізаваць праз гэтую лётарэю сродкі для ўзмацненьня санітарнай культуры шырокіх працоўных мас. Але, шмат якія камітэты на гэта забываюць.

Пралетарская грамадзкасьць ня ведае аб праходзячай зараз лётарэі. Друк як цэнтральны, так і мясцовы зусім не асьвятляе гэтай кампаніі, між тым у лётарэйную камісію пры ЦК Т-ва ўваходзяць прадстаўнікі амаль усіх рэдакцый цэнтральных газэт, якія на пасяджэньнях лётарэйнай камісіі бываюць, але нічога ня пішуць аб лётарэі.

У свой час ЦВК, ЦК ЛКСМБ, ЦСПСБ, НК Асьветы, Белкалгасцэнтр, НКАховы Здароў'я і інш. далі паказаньні па сваіх нізоўках аб актыўным удзеле і дапамозе Чырвонаму крыжу ў правядзеньні лётарэйнай кампаніі, а яны ня правяраюць выкананьне дадзеных дырэктыў, па гэтым пытаньні ў выніку чаго чырвонакрыжныя арганізацыі не атрымліваюць ніякой дапамогі з боку раённых установ і ўсяе грамадзкасьці.

Усё гэта гаворыць за тое, што ў справе рэалізацыі білетаў лётарэі Чырвонага Крыжу яшчэ існуе самацёк, які неабходна тэрміновым парадкам зьнішчыць.

Гірко.

Чырвонакрыжная хроніка

У г. Клімавічы гэтымі днямі адбыўся выпуск курсаў чырвоных мэдсясьцёр. Усяго падрыхтавана на курсах 45 сясьцёр. Выпускніцы прыслалі ЦК Чырвонага Крыжу БССР прывітальную тэлеграму, у якой запэўнілі ЦК Чырвонага Крыжу ў тым, што яны поўнасьцю выканаюць ускладзеныя на іх задачы ў галіне сацбудаўніцтва.

15 бібліятэчак Чырвонага Крыжу паслаў Менскі Гарком Ч. К. у саўгасы і калгасы прыгарадных сельсаветаў. Разам з бібліятэкамі высланы і аптэчкі. Гарком падрыхтаваў і хутка выслае яшчэ 15 бібліятэчак.

Два зубаўрачэбных габінэты-перасоўкі паслана Менскім Гаркомам Ч. К. у буйнейшыя калгасы прыгараднага сельсавету. Зубаўрачэбныя габінэты прабудуць у калгасах па два месяцы кожны.

Гектар Чырвонага Крыжу засеяны калгасам «Узражджэньне» Менскага прыгараднага сельсавету. Калгас «Узражджэньне» выклікаў пасьледваць яго прыкладу калгасы імя Сталіна, імя Менгарсавету і імя Дзяржынскага.

Адкрыты Мэдпункт пры дзіцячым доме адпачынку ў калгасе «Кастрычнікавая рэвалюцыя», Ратамскага прыгараднага сельсавету. Пры мэдпункце ёсьць амбуляторыя і дзіцячы ізалятар-стацыянар. Мэдпункт разьлічаны на 60 дзяцей.

15.124 руб. 28 к. сабрана па гор. Менску і прыгарадных сельсаветах у дапамогу пацярпеўшым ад землятрасеньня ў Нахічавані.

Зрываецца работа вячэрніх курсаў чырвоных мэдсясьцёр. Менскі кам гас не прадставіў памяшканьня для заняткаў і курсам кожны вечар прыходзіцца шукаць сабе памяшканьня. У выніку гэтага на курсах наглядаецца адсеў.

У выніку недагаворанасьці паміж Менскім Райкалгассаюзам і Ахмат младам ня выкананы плян адчыненьня дзіцячых ясьляў і пляцовак па лініі Менскага Гаркому Ч. К. у прыгарадных саўгасах і калгасах. Замест 5 пунктаў адкрыта толькі два, хаця былі ўсе магчымасьці выканаць плян поўнасьцю.

Недаацэнілі давыбараў ў гарсавет

Прэзыдыум Менгарсавету 12 красавіка, у зьвязку з паднятым газэтай «Савецкай Беларусі» пытаньнем аб недавыбарах у Гарсавет пастанавіў: правесьці дадатковыя перавыбары на тых вучастках, дзе яны не адбыліся ў час перавыбарчай кампаніі.

Выбарчай камісіяй былі вылучаны для выбараў 12 вучасткаў.

З 12 вучасткаў—сходы адбыліся толькі ў двух: утрыманцаў вайсковаслужачых часьцей Менскага гарнізону і ўтрыманцаў рабочых і служачых членаў Саюзу сувязі. Зрыў выбарчай кампаніі нізавыя прафарганізацыі тлумачылі выключна тым, што час перавыбараў прышоўся з паводкай і падрыхтоўкай да сьвят першага мая.

Выбарчая камісія сумесна з прадстаўнікамі ЦП Саюзаў на сваём паседжаньні 6-га мая кваліфікавала гэтыя адносіны нізавых прафарганізацый да важнейшай справы як апартуністычную недаацэнку палітычнай важнасьці кампаніі дадатковых перавыбараў.

З 10 вучасткаў, на якіх у другі раз былі вызначаны перавыбары, зноў не адбыліся на 9. Толькі па адным вучастку, утрыманцаў членаў саюзу Мэдсанпрацы сход адбыўся, дзякуючы падрыхтоўчай і растлумачальнай рабоце праведзенай, арггрупкомамі і асабліва прыкладнай работы рабочага брыгадзіра т. Гурэвіча.

Такім чынам па тым вучасткам, дзе прафарганізацыі праявілі дастатковую падрыхтоўчую і растлумачальную работу вынікі атрымаліся здавальняючыя.

Зрыў сходаў утрыманцаў рабочых і служачых **заводаў імя Варашылава, і «Полымя Рэвалюцыі»** тлумачыцца выключна бязьдзейнасьцю ваўкомаў.

Выклікае абураньне факт меўшы па кусту камунальнікаў. **У дзень і час сходу, загадчык зачыніў клюб на замок, а сам кудысь то паехаў.**

Насьцен газэты і шматтыражкі ня гледзячы на просьбу выбарчай камісіі таксама нічога ня зрабілі ў напрамку падрыхтоўкі і правядзеньня давыбараў.

А. Воўкаў.

ЗАДАНЬНЕ 240 тысяч га лёну і 40 тыс. га канапель ВЫКАНАЦЬ

Змагацца ня толькі за пашырэньне плошчы пасеву, але і за ўраджайнасьць лёну і канапель

Раўняйцеся па калгасу „Чырвоны Камунар“, які выканаў плян пасеву лёну на 250 проц.

ПОЛІВА ПАДВЫШАЕ ЎРАДЖАЙНАСЬЦЬ ЛЁНУ

Барацьба за лён у сучасны момант ёсьць адна з важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній на вёсцы, у якой павінны быць скарыстаны ўсе магчымасьці. Побач з барацьбой за плошчу, за выкананьне і перавыкананьне пляну пасеву, вялізарная ўвага павінна быць зьвернута на рад агрыкультурных мерапрыемстваў, накіраваных на падняцьце ўраджайнасьці. З гэтых мерапрыемстваў далёка не апошняе месца займае поліва пасеваў—гэты элемэнтарны прыём агратэхнікі. Вялікая засьмечанасьць нашых палёў, як спадчына старога, яшчэ стаіць перашкодай у справе падняцьця ўраджайнасьці. Шмат энэргіі яшчэ прыдзецца аддаць на яе ліквідацыю. Умовы-ж буйнай калектыўнай гаспадаркі на базе высокай тэхнікі даюць усе магчымасьці пасьпяхова з ёю справіцца.

Клясавы вораг на вёсцы яшчэ не ліквідаваны. У любым мерапрыемстве, якое накіравана на карысьць сацыялістычнага будаўніцтва ён спрабуе за ўсё хапацца, каб перашкодзіць яго правядзеньню.

І як ня дзіўна, але і ў пытаньні поліва пасеву, здавалася-б такім відавочна-карысным мерапрыемстве ён знаходзіць «магчымасьць» агітацыі супроць.

У якасьці «напрактыкаваных» гаспадароў, кулак і падкулачнік агітуюць супроць поліва лёну, матывуючы гэта тым, што пустазельле нібы «падтрымлівае» лён, абараняе яго ад выляганьня.

Пустазельле зьяўляецца шкодным для пасеваў, бо жыве за кошт апошніх, зьніжаючы ўраджай на 20, 30, а часам і на 50, і нават больш процантаў. Асабліва небясьпечным яно зьяўляецца для лёну, які вельмі баіцца яго.

Ня меншую шкоду прыносіць пустазельле і ў барацьбе за вільгаць. Чымся больш засьмечана поле, тым больш яно траціць вільгаці і тым больш небясьпечнымі для пасеваў зьяўляюцца часовыя сухмені і нават кароткія пэрыоды сухменю.

Пры адсутнасьці поліва, пустазельле да часу прыборкі лёну прыносіць вялізарны ураджай насеньня. Значная частка яго абсыпаецца ў часе ўборкі лёну і засьмечвае глебу, павялічваючы штогод ужо маючыйся запас яго. А дзякуючы сваім жыцьцёвым здольнасьцям, яно там ня гіне, а можа паступова прарастаць на працягу цэлага раду год, засьмечваючы і пасевы засеяныя чыстым насеньнем.

Цэлы рад хвароб лёну, таксама найлепш разьвіваецца ў засьмечаных пасевах. Вельмі яскрава гэта выяўляецца на найбольш шкоднай хваробе лёну—іржы.

Засьмечаныя пасевы даюць заўсёды няроўную салому, а гэта таксама вельмі шкодзіць далейшай апрацоўцы і зьніжае якасьць прадукту.

Яшчэ шмат шкоды робіць пустазельле, але і паказаных дастаткова, каб яскрава ўбачыць рашучую неабходнасьць барацьбы з ім.

Неабходна падаць толькі некалькі лічбаў эфэкту поліва, якія атрыманы дасьледчымі ўстановамі.

Так, на Пскоўскай дасьледчай станцыі поліва лёну павялічвала ўраджай валакна на 36 проц. і насеньня на 84%. А на Маскоўскай двухразовае поліва давала павялічэньне ўраджаю па валакну на 120 проц. і па насеньні—на 230 проц.

Гэтыя лічбы гавораць аб неабходнасьці рашучай барацьбы з пустазельлем.

У гэтай барацьбе ў далейшым выключнае значэньне зоймуць спосабы папераджальнага характару, у выглядзе агульных агрыкультурных мэтадаў, як правільная апрацоўка глебы, угнаеньне, пладазьмен і інш. Для гэтага дала шырокія магчымасьці сацыялістычная рэканструкцыя сельскай гаспадаркі і мэханізацыя.

Але ў першы час выключную ўвагу заслугоўваюць і сродкі зьнішчальнага характару. У барацьбе з пустазельлем, якое ўжо разьвілося ў пасевах, мы па сутнасьці маем зараз два спосабы. Гэта хімічная барацьба і поліва пасеваў. Першы спосаб будзе мець бязумоўна большае значэньне, але ў даны час мы, нажаль, яшчэ ня маем у дастатковай колькасьці адпаведных, добра выпрабаваных на лёне хімікалій. Таму асноўную ўвагу павінны зьвярнуць на поліва пасеву.

Ужо вышэйпаданыя меркаваньні даюць магчымасьць вылучыць і найбольш жаданыя тэрміны поліва. Найбольш небясьпечным пэрыядам для пасеву лёну зьяўляюцца першыя тыдні пасьля ўсходаў. У гэты час і расьліна яшчэ не дасягае значнай вялічыні і таму для яе будзе менш небясьпекі ад мэханічных перашкод пры апрацыях поліва.

Лепшым тэрмінам поліва будзе пачатак трэцяга тыдню пасьля ўсходаў, ці стадыя, калі лён дасягае ў даўжыні ня больш 7—10 см. Калі пасьля поліва зноў разаўецца пустазельле—неабходна прапалоць другі раз, але калі пры гэтым лён мае вышыню ня больш 15 см. У больш позьні час поліва можа значна пашкодзіць, абламаць расьліны, і таму пазьніцца з ім ні ў якім разе нельга.

Такім чынам, першая ўмова—не пазьніцца з поліваім. Спосабы-ж поліва будуць залежаць ад некалькіх умоў. Першай з гэтых умоў будзе спосаб пасеву. Калі радковая сяўба дапускае мэханізацыю поліва дык раскідны пасеў дазваляе выключна ручное поліва.

Гэтага зусім дастаткова, каб з усёй рашучасьцю ўзяцца за гэту справу і не прапусьціць тэрмінаў. Зараз-жа неабходна скласьці брыгады па поліву і замацаваць за імі асобныя вучасткі. Трэба ўвесь час памятаць, што гэта вельмі адказнае зьвяно мерапрыемстваў у пасьпяховай барацьбе за лён.

А. Л.

За пасевамі лёну трэба даглядаць

Калі глеба пад лён была добра апрацована і для пасеву ўзята добрае, пра веранае на ўсхожасьць лёнанасеньне, то ўсходы лёну пачынаюць зьяўляцца на 5-6 дзень пасьля сяўбы, а поўныя масавыя ўсходы—праз 8-10 дзён.

Пры ўмовах ,якія не спрыяюць усходам (засушлівая вясна, дрэнная апрацоўка глебы перад пасевам і інш.), ус ходы могуць затрымацца на 3-5 дзён.

У кароткі тэрмін ад сяўбы лёну да зьяўленьня ўсходаў неабходна пільна сачыць за пасевамі ,бо ўсходы могуць затрымацца яшчэ з адной прычыны, а зменна: ад утварэньня глебавай скарынкі.

Глебавая скарынка утвараецца ў тым выпадку, калі пасьля пасеву былі вялікія дажджы, а пасьля дажджоў на ступіла гарачае надвор'е. Ад дажджу дробныя, пыляватыя часьцінкі глебы сплываюцца і пасьля высыханьня на паверхні глебы ствараецца шчыльная скарынка ,праз якую малады расток лёну ня можа прабіцца на паверхню. Дзякуючы таму, што глебавая скарынка не дапускае ў глебу паветра, расток там можа задыхнуцца і запінуць.

Калі да абыходу лёну стварылася скарынка, дык частка расткоў загіне, а выхад з зямлі астатніх расткоў расьцягнецца на ненармальна доўгі пэрыяд, у выніку чаго атрымаюцца няроўныя ўсходы, а ў далейшым няроўны рост і неадначасовае пасьпяваньне лёну. Ад гэтага значна памяншаецца колькасьць і якасьць лёнаваланна.

Найбольш часта глебавая скарынка ствараецца на цяжкіх глінстых глебах, у складзе якіх маецца значная колькасьць дробных, пыляватых глебавых часьцінак.

Для зьнішчэньня скарынкі ўжываецца лёгкі драўляны каток, лепш зубчасты. Калі няма катка, скарынку можна зьнішчыць лёгкім баранаваньнем.

Зьнішчаць скарынку каткам і баранаваньнем можна толькі тады, калі глеба пасьля дажджу добра прасохне . ня будзе наліпаць на каток і зубы бараны.

Зразумела, што прыціскаьне каткам ці баранаваньне пасьля абыходу лёну будзе яму шкодзіць, бо будуць ламацца маладыя расьліны, а таму зьнішчаць глебаваю скарынку трэба ў пэрыяд ад сяўбы да збыходу лёну.

Кінуць сілы на адстаючы вучастак

Вушацкі раён павінен спэцыялізаваць сваю гаспадарку ў бок лёнаканаплядводнага ўхілу. Значыцца засеў тэхнічных культур зьяўляецца адным з першачарговых задач веснавой сяўбы.

Як-жа выконваецца гэта важная дырэктыва партыі і ўраду асобнымі сельсаветамі і раёнамі?

А вось:

На 25-га мая плян засеву тэхкультур выкананы толькі на 13 проц. Асабліва цягнуцца ў хвасьце сельсаветы: Гарадзецкі, Чарапоўшчынскі, Весьніцкі, Жарскі і Сарочынскі. Яны ў сярэднім выканалі сваё заданьне толькі на 7,6 проц.

На гэты адстаючы вучастак павінны быць кінуты ўсе сілы.

Карцель і Шэнкман

„Чырвоны Камунар“ плян засеву лёну выканаў на 250 пр.

БЫХАЎ. (Наш кар.). Папярэднія даныя аб ходзе пасеву тэхнічных гавораць аб поўнай магчымасьці выкананьня і перавыкананьня плянавых намётан. Так:

калгас «Чырвоны Камунар» 1 Грудзінскага сельсавету выканаў плян засеву лёну на 250 процантаў замест 4 га, па пляну засеяў 10 га.

Калгас «Шлях да сацыялізму» (С.-Халапеева) перакрыў заданьне па лёне і канаплях на 2,5 га.

Павялічвае засеў тэхнічных калгас «Парыская Камуна» і рад інш.

Калгас «Праўда» (Мокрае) пакуль што адзіны, які зрывае засеў 2 га канапель (ня прадугледжана загадзя глеба).

Надтачэў.

Сёньня а 7 гадзіне ўвечары ў клюбе друкароў

АДБУДЗЕЦЦА

АДКРЫТЫ АГУЛЬНЫ СХОД

парткалектыву рэдакцый цэнтральных газэт і друкарні „Зьвязда“

Яўка ўсіх членаў і кандыдатаў партыі. а таксама камсамольцаў абавязкова.
Запрашаюцца беспартыйныя рабочыя друкарні і супрацоўнікі газэт.

Бюро парткалектыву.

Змагацца за кожную тарфяную цэглу



Торфаздабыча пад ударам

Торфасэзон у разгары. Гэтыя дні зьяўляюцца паказальнымі для торфаздабываньня таму, што з гэтага часу павінна пачацца ўзмацненая работа на торфазаводах і ад пасьпяховага выкананьня пляну гэтых дзён залежыць выкананьне сэзоннай праграмы.

На 5-га чэрвеня календарны плян па машыннаму торфу ў 116.500 тон выкананы да 33.426. Такім чынам, календарны плян на 5-га чэрвеня выканаць на 28,7 проц. Гадавы-ж плян выкананы толькі на 8,1 проц.

Тарфянікі.

Што-ж да здабываньня малагідраторфу, дык плян 3.430 тон выкананы толькі на 1,220 тон, што ў адносінах да календарнага пляну дае 35,6 проц., а ў адносінах да гадавога на 2,1 проц.

На 5-га яшчэ ня прыступлена да выпрацоўкі фрэзэрнага і рэзанага торфу.

Па ўсім Белторфе агульнае заданьне 128.290 тон выкананa на 34.646 тон, што ў адносінах да календарнага пляну складае 27 проц., а ў адносінах да гадавога пляну складае 4,95 проц.

Што-ж да забесьпячэньня рабочай сілай, дык на сёньняшні дзень на торфараспрацоўках працуе толькі 60 пр. тарфянікаў і 41 проц. неабходнай колькасьці тарфяніц. Пагоршаньне становішча в рабочай сілай стварае зараз пагрозу зрыву пляна. Калі раней ня ўсе машыны былі пушчаны ў ход і маючаяся рабочая сіла магла абслужыць гэтыя машыны, дык зараз у сувязі з пускам новых машын, маючаяся колькасьць рабочай сілы аказалася недастатковай.

З другога боку мы наглядаем такія зьявішчы, калі існуючыя брыгады распадаюцца як гэта здарылася на Асінторфе. На гэтым заводзе замест 24 брыгад працуе зараз 21. Некалькі машын у сувязі з гэтым не працуюць.

З-за адсутнасьці рабочай сілы завод «Шлях Сацыялізму» скарочвае праграму выпрацоўкі бо не хапае рабочай сілы для абслугоўваньня машын.

Калі прасачыць як ідзе работа на больш буйных торфараспрацоўках Беларусі, як выконваецца дзённая праграма, а гэта значыцца, як ушчыльнены рабочы дзень, як пастаўлена вытворчая работа на прадпрыемствах і як завадзкія арганізацыі спраўляюцца са сваімі задачамі, дык мы ўбачым досыць сумны малюнак работы гэтых заводаў.

Асінторф выконвае сваю праграму на 48,4 проц. дзеннай выпрацоўкі. Завод «1-га Мая»—42,6 проц., «Бальшавік»—42,8, «Грабенева»—64,2 проц., «Новая Беларусь»—51,5 проц., і г. д.

Толькі адзін торфазавод «Давідаўка» за 3-га чэрвеня выканаў сваю дзённую праграму на 100,4 проц. і за 4-га чэрвеня 90,1 проц. Па БССР дзенная праграма здабываньня торфу за апошнія 3 дні зьніжаецца. Калі за 2-га чэрвеня дзеннае здабываньне складала 45 проц., дык за 3 чэрвеня яно дае 43,7 проц. і за 4—43 проц.

Такім чынам, праграма здабываньня торфу па Беларусі знаходзіцца пад вельмі сур'ёзнай пагрозай зрыву.

Забесьпячэньне торфазаводу рабочай сілай набывае зараз вялізарнае значэньне. Вярбованыя арганізацыі павінны павялічыць тэмпы вярбоўкі ў некалькі разоў. Рабочая сіла павінна быць. Ня можа быць такога становішча калі-б машыны стаялі ў бязьдзей насьці.

Ня менш важнай праблемай зьяўляецца пуск усіх торфамашын у эксплёатацыю. На 5-га чэрвеня з 75 фармованых торфамашын працуе толькі —51, а 24 машыны бязьдзейнічаюць. Яны паглыбляюць прарыў.

Мы ўжо неаднакроць пісалі аб тым, што на торфазаводах партыйныя арганізацыі і прафсаюзы не разьвілі яшчэ работы па шырокім уцягненьні рабочых у сацыялістычнае спаборніцтва. Сацыялістычныя мэтады працы яшчэ не прышчапіліся на торфараспрацоўках. Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі адказваюць за ўцягненьне ў работу па сацыялістычным спаборніцтве і ўдарніцтве.

М. Н.

Апэрацыйнае сводка

дзённага здабываньня торфу за апошнія дні па найбольш буйных торфазаводах БССР (у процантах).

	За 2 чэрвеня	За 3 чэрвеня	За 4 чэрвеня
1. „Шлях Сацыялізму“	Зьвестак няма	Зьвестак няма	Зьвестак няма
2. Асінторф	48,4	61,2	54,9
3. „1-га мая“	42,6	33,2	Зьвестак няма
4. „Чырвоная Беларусь“	—	—	—
5. „Грэбянёва“	64,2	75,8	Зьвестак няма
6. „Калектыўная праца“	Зьвестак няма	Зьвестак няма	„
7. „Бальшавік“	42,8	46,2	40,4
8. „Чырвоны Кастрычнік“	Зьвестак няма	42,8	42,8
9. „Чырвоны Сьцяг“	„	Зьвестак няма	Зьвестак няма
10. „Давыдаўка“	70,4	100,4	90,1
11. „Новая Беларусь“	51,5	52,7	68,7
12. „Рэмізава“	не працуе	не працуе	не працуе
Па Белторфе	45,0	43,7	43,0

Умову трэба выканаць

Новая юрэдытная рэформа справа добрая. Сваячасовае плянавае выкананьне гаспадарчых умоў робіць вялікую дапамогу ў нашым будаўніцтве. Але ёсьць у нас такія арганізацыі, якія ня хочуць гэтага зразумець.

Шклозавод «Кастрычнік— (Сьвіслацкі раён) заключыў згоду з Бабруйскім аддзяленьнем «Саюзхлеба» на забесьпячэньне аўсом на май і чэрвень месяцы для транспарту заводу ў колькасьці 82 цнт., але да гэтага часу завод проста «вырваў» ад Бабруйскага аддзяленьня «Саюзхлеба» 15 цнт. аўса і зараз яшчэ недаатрымаў за мінулы месяц 26 цнт. Калі завод пачаў патрабаваць ад Бабруйскага аддзяленьня «Саюзхлеба» выкананьня ўмовы аб водпуску аўса, дык супрацоўнікі «Саюзхлеба» т. т. Гольдберг і Каган адказалі: «аўса ў нас няма, а ўмову вы можаце адкласьці ў бок, бо гэта толькі мяккая папера».

Належныя органы павінны прымусіць Бабруйскае аддзяленьне «Саюзхлеба» выкананаць заключаны дагавор.

А. Горэцкі.

ДА ПРЫЕЗДУ РАМЭНА РАЛАНА Ў СССР

Рамэн Ралан неаднакроць у сваіх лістох да М. Горката выказвае жадань не наведаць Саюз Саветаў.

У адказ на запросіны, пасланыя т. Халатавым Р. Ралану прыехаць гэтым летам у СССР гэтымі днямі атрымаў ліст ад Ралана, які мы падаем:

Дарагі Халатаў!

Я дзякую вам за ваш прыяцельскі ліст ад 18 мая. Я зусім ня ўлэўнены ў тым, што змагу гэтым летам прыехаць у СССР. І ва ўсякім выпадку калі-б я прыехаў, я буду толькі ў Маскве—ды і то на працягу вельмі абмежаванага часу.

Сапраўды здароўе маё цяжка парушана, асабліва пасьля запаленьня лёгкіх, якое я перанёс у сьнежні мінулага году, і гэта патрабуе вялікай асьцярожнасьці. Я лічу, што ў інтарэсах той справы, якую мы з вамі адстойваем, маё жыцьцё (якім я сам даражу вельмі мала) магло-б быць працягнута яшчэ на некалькі год, бо я добра ўяўляю сабе (я гавару аб гэтым не ў дагоду майму самалюбію, а больш з жалем), што ў галіне абароны (аддаснасьці) СССР, які разам з тым зьяўляецца інтэрнацыяналам пралетарскай працы, замяніць мяне на Захадзе, у радох яго інтэлігенцыі, будзе нялёгка. Птушкі маёй пароды сярод іх—„rara avis“ [1])

Асабліва я хацеў-бы прыехаць, каб паціснуць рукі прыяцелям, якія мне блізкія—як Горкі,—і вам, асабіста сваім знаходжаньнем у Маскве засьведчыць непасрэдна маю брацкую сымпатыю і адданасьць.

У бліжэйшыя дні я павінен параіцца з маім доктарам у Цурыху для таго, каб ён дакладна мне сказаў, што я магу рабіць і што ён мне дазваляе. Ад яго адказу будзе залежыць маё рашэньне. І я аб ім зараз-жа паведамлю маіх маскоўскіх прыяцеляў.

Сардэчна паціскаю вашу руку.

Ваш Рамэн Ралан.

[1]) Лацінскі тэрмін: «рэдкая птушка».

За калас — бупрацэ — кулака

Пасьля сталай падрыхтоўкі да пасеў кампаніі дружна і арганізавана выехалі на поле калгасьнікі калгасу «Новыя Русакі». Адны яны на полі працавалі толькі два дні. На трэці дзень аднаасобнікі напісалі калектыўную заяву, сабралі насеньне і выехалі на поле да калгасьнікаў, заявіўшы: «з сёньняшняга дню мы калгасьнікі. Вось вам насеньне і заява, а коні з намі». І дружнай сям'ёй пачалі работу.

У другі калгас «Калектыўная Праца», Чарнаруцкага сельсавету, за час сяўбы ўступіла 78 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Прыліў наглядаецца і ў іншыя калгасы. **Р. Ш.**

Калгас «Пралетарская Перамога» Халопеніцкага раёну, Грыцьякоўскага сельсавету, пачаў сяўбу 26 красавіка. Да сяўбы ў калгасе было толькі 43 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. На полі калгасьнікі працавалі з захапленьнем—ударнымі тэмпамі. Дзівіліся адна асобнікі гледзячы на працоўны энтузіязм калгасьнікаў. У выніку праз некалькі дзён у калгас уступіла 43 новых бядняцка-серадняцкіх гаспадарак.

Зараз вёска калектывізавана на 95 проц. Калгас поўнасьцю перайшоў на зьдзельшчыну. На 27 мая засеяна плошча ў 170 га. Пасеяна 17 га лёну.

На дапамогу адстаючаму саўгасу «Сьвінавода» «Чырвоны Молат» калгасьнікі паслалі ўдарную брыгаду і 9 пад коняй. Арганізаваны брыгады на дапамогу калгасу «Энэргія».

Дамінікаў Р. В.

Дзякуючы правільнаму кіраўніцтву Віцебскага Гаркому КП(б)Б мы маем вялікі зрух у калектывізацыі прыгарадных сельсаветаў. На 1-га чэрвеня гэтыя сельсаветы калектывізаваны на 27,9 проц. А некаторыя асобныя сельсаветы маюць куды большыя дасягненьні, напрыклад, Шумнянскі сельсавет калектывізаваны на 74,1 проц., Бабініцкі—на 64,7 проц., Бараўлянскі—на 60,5 проц.

Але адначасова трэба адзначыць, што частка сельсаветаў яшчэ плятуцца ў хвасьце. Напрыклад, Міхалеўскі сельсавет калектывізаваны толькі на 20 проц., В. Летчанскі—на 21 проц. Абмежавацца гэтым зусім нельга. Трэба яшчэ больш шпаркімі тэмпамі пашыраць калгасны прыліў і ўзмацняць калгасы.

Брыгада «С. Б.» С. Мірыін і Дварсон.

Дзякуючы растлумачальнай рабоце сярод насельніцтва і добрай падрыхтаванасьці да сяўбы ў калгас «Чырвоная Украіна», Камарынскага раёну, Гдзенскага сельсавету, пачаўся вялікі прыліў. За апошнюю дэкаду ўлілася 31 бядняцка-серадняцкая гаспадарка. 24 мая адбыўся сход калгасьнікаў разам з аднаасобнікамі. На гэтым сходзе ў калгас уступіла 25 бядняцка-серадняцкіх гаспадарак. За 15 дзён калгас вырас на 50 проц. Настрой у калгасьнікаў бадзёры. Ня гледзячы на вялікія страты ад паводкі, ад якой загінула 45 га пасеваў, калгас ліквідаваў гэты прарыў і пасеў у асноўным скончыльі да 1-VI—31 г.

Х. Кляцкоў.

Барсукоўскі сельсавет, Кармянскага раёну, на 1-V-31 г. калектывізаваны на 55 проц. Асобныя вёскі, напрыклад, вёска Рэвут калектывізаваны на 100 пр. Толькі ў калгасе «Памяць Леніна» прыліў ідзе вельмі марудна. Але гэтыя хібы можна зьнішчыць, калі забясьпечыць калгас «Памяць Леніна» сталым кіраўніцтвам і ўзьняць дысцыпліну. Да таго-ж калгас трэба ачысьціць ад гуль таёў, прагульшчыкаў і іншых элементаў. Толькі тады можна будзе дабіцца значнага прыліву.

Праходзячы.

Ніводнага калгасу не арганізавана ў Кабішчанскім сельсавеце, Гарадоцкага раёну. Сельсавет зусім ня цікавіцца калектывізацыяй і не праводзіць ніякай растлумачальнай работы сярод беднаты і серадняковаў аднаасобнікаў. Кулакі ўзмоцнена агітуюць супроць калгасаў не сустракаючы належнага адпору з боку сельсавету. Сельсаветам у рабоце дапушчана рад «левацкіх» перагібаў, калі цьвёрдыя заданьні даводзіліся да серадняковаў. Адначасова з гэтым сапраўдныя кулакі неабкладзены. Партыйная ячэйка ня цікавіцца работай сельсавету і не дапамагае яму. Веснавая сяўба па сельсавеце праходзіць марудным тэмпамі.

А. Трэлін.

У Высоцкім сельсавеце Шклоўскага раёну, уся работа па калектывізацыі праводзіцца прыезджымі работнікамі брыгадамі нясыстэматычна, а кампанейскі. Сельсавет-жа нават ня ведае, якую работу правялі брыгады у той альбо іншай вёсцы, ці калгасе.

З 27 членаў сельсавету толькі трое зьяўляюцца калгасьнікамі. Ёсьць выпадкі, калі паасобныя члены сельсавету разам з кулакамі праводзяць антыкалгасную агітацыю.

Ходам веснавой сяўбы сельсавет не кіруе. Пленум сельсавету, калі трэба было абгаварыць пытаньні аб падрых тоўцы да веснавой сяўбы, сабраўся толькі тады, калі пачалася сяўба. Паасобныя члены сельсавету ў часе сяўбы парушаюць устаноўленыя межы і тэрміны, дэзарганізуючы гэтым ход веснавой сяўбы. Сельсавет нічога гэтага ня бачыць і наогул яму невядома як праходзіць веснавая сяўба.

Пасьпяшаць сельсавету скарыстоўвае кулак, які арганізоўвае антыкалгасную агітацыю. Больш таго, абнатлелы кулак даходзіць да тэрору. Так, у в. Папоўцы кулакі парэзалі нажамі 3-х калгасьнікаў. У калгасе «Чырвоная Паляна» парвалі насьцегазэту.

Д. Швараб.

Кармавая база—

ГАЛОЎНАЕ ЗЬВЯНО ЖЫВЁЛАГАДОЎЛІ

ПАПЯРЭДЗІЦЬ ПРАРЫВЫ НА СІЛОСНЫМ ФРОНЦЕ

Аршанскія галавацяпы палеташняму пляны па сіласаванью „сіласуюць" у габінэтах.

Сіласныя ўстаноўкі ня будуюцца. Сяўбу заканчваюць пры недасеве кармавых культур

ВОРША (наш. кар.). Аршанскі раён мае жывёлагадоўчы і садова-гародны напрамак. Як вядома для жывёлагадоўлі вельмі важнае значэньне мае стварэньне кармовай базы.

Сяўбу Аршанскі раён закончвае са значным недасевам кармовых культур (вікі, канюшыны), бо нехапіла насеньня. Такім чынам зараз уся надзея застаецца на сілос, які павінен будзе замяніць кармы.

Мінулыя гады ўжо добра навучылі калгасы, што без кармоў заставацца нельга. Вурокі мінулага году патрабуюць асаблівай увагі кармоваму пытаньню і ў прыватнасьці сіласу, як таннаму і добраму корму.

У мінулым годзе сіласная кампанія па Аршанскім раёне была сарвана, бо на сілас глядзелі, як на нешта непатрэбнае. Але тыя калгасы, што хоць часткова выканалі пляны сіласаваньня дастаткова ўпэўніліся, што сілас вельмі карысная рэч.

У гэтым годзе сіласу адводзіцца на Аршаншчыне значнае месца. Па пляну павінна быць засілясавана ў саўгасах—8829 тон, у калгасах—6957 тон, і ў аднаасобным сэктары—302 тоны сіласнай масы. Улічваючы значны рост калгасаў па раёне, а разам з гэтым і рост калгасных статкаў, райкалгассаюз дадзеную яму Наркамземам лічбу павялічыў да 9.975 тон. Выкананьне гэтага пляну па сіласаваньні дасьць магчымасьць калгасам вырашыць кармовае пытаньне, а для гэтага па раёне павінна быць пабудавана 48 ям і 48 траншэй. Звыш гэтага райкалгассаюз мяркуе яшчэ пабудаваць у калгасах 4 вежы на 4.000 кубамэтраў сіласнай масы.

Пляны сіласнай кампаніі павінны быць даведзены да калгасаў і вёсак не пазьней 10 чэрвеня, а да 1-га ліпеня—скончана будаўніцтва сіласных установак. Тэрміны патрабуюць ударных тэмпаў работы, а гэтага мы ня бачым у Аршанскім раёне.

Ня ўсе жывёлагадоўчыя калгасы забралі вызначанае ім насеньне сіласных культур, а некаторыя нават і зусім адмаўляюцца браць, ня гледзячы на недасеў кармовых траў. Трэба проста сказаць, што сёлета, як і летась мы маем недаацэнку значэньня сіласу з боку асобных калгасаў і недастаткоўю ўвагу яму з боку Райза і райкалгассаюзу.

Сіласная кампанія павінна быць пастаўлена на рэйкі сацспаборніцтва і ўдарніцтва. Трэба ўсімі сламі і сродкамі дабіцца, каб у гэтым годзе сіласная кампанія ня толькі не сарвалася, але пляны яе былі-б выкананы і перавыкананы.

А. Сёмкін.

Сымптомы сур'ёзнай хваробы

ДЫРЭКТАРА БЕЛСЕЛЬБУДУ СЬЛІЎКІНА ЯКОМУ ПАТРЭБНА „ХІРУРГІЧНАЯ ДАПАМОГА" ПРАКУРАТУРЫ

Будаўніцтва ў саўгасах «Сьвінаводу» праходзіць вельмі марудна. У выніку абураючага фармалізму і бяздушнага бюракратызму Белсельбуду не пачынаецца будаўніцтва ў 6 нядаўна арганізаваных саўгасах: **Хальч, Нобар, «Прагрэс», «Прывольле», Мсьціслаўе і Красьніца.**

У чэрвені г.г. ў гэтых саўгасах пачнецца ўкамплектаваньне сьвінога стада, якім да канца году вызначана мець 1.500 дарослых матак і 5.000 адкормачных сьвіней.

Але саўгасы ня маюць ніводнай будыніны, няма дзе паставіць сьвіней, кароў, коняй, няма жылых памяшканьняў, таксама няма іншых гаспадарчых будынкаў, як сьвірны, сырабойні і г. д. На будаўніцтве ў гэтых саўгасах «Сьвінавод» асыгнаваў 1.237.000 руб., будаўнічая праграма зацьверджана, але да сёньняшняга дню будаўніцтва не пачата. Дырэктар Белсельбуду тав. Сьліўкін упарта адмаўляецца весьці гэтыя работы. Ні довады «Сьвінавода», ні пастанова калегіі НКЗБ ня могуць пераматаць упартасьці т. Сьліўкіна. Між тым, Саюзсельбуд яшчэ ў красавіку даў паказаньні Белсельбуду праводзіць гэтыя работы. Ніхто не спрачаецца, што цьвёрдасьць вельмі добрая справа, але калі яна накіравана на шкоду, на зрыў плянавых меркаваньняў, дык гэтая цьвёрдасьць зьяўляецца проста шкодніцтвам.

Мы патрабуем ад Белсельбуду не чакаць пастановы калегіі НКЗ СССР і зараз-жа прыступіць да будаўніцтва ў гэтых саўгасах. Калі цяпер не пачаць работу,—дык будзе сарваны плян кам плектаваньня па гэтых саўгасах. Гэтага ні ў якім выпадку нельга дапусьціць.

Н. Д.

ДАЦЬ ДОГЛЯД СЬВІНЬНЯМ

Калгас «Вольная Беларусь» Слуцкага раёну ў мінулым годзе меў сьвінагадоўчы напрамак. Летась у калгасе быў пабудаваны спэцыяльны сьвінарнік, які каштаваў добрых пару тысяч рублёў.

Зараз калгасу нададзен жывёлагадоўчы ўхіл. Сьвіней перадалі другому калгасу, а часткова прадалі. У калгасе зараз засталося 28 галоў, з якіх 19 матак. Праўленьне калгасу не зварочае ніякай увагі на догляд за сьвіньнямі. Сьвіней трымаюць ня ў новым сьвінарніку, а ў старых хлявох, кормяць іх вельмі дрэнна, з прычыны дрэннага догляду ўвесь прыплод ад сьвіней гіне.

Папяровыя душы з райкалгассаюзу ня ведаюць дзе і як арганізуюцца фэрмы

Па Вушакім раёне намечана арганізацыя 6 сьвінагадоўчых таварных фэрм, але ніводная з іх на сёньняшні дзень не працуе.

Вельмі дрэнна ідзе з укамплектаваньнем фэрм. Па пляну на фэрмах павінна было быць 60 галоў сьвіней, а колькі іх ёсьць—райкалгассаюз і сам добра ня ведае, бо ніякага вучоту няма. Інструктар райкалгассаюзу думае, што прыблізна штук 240 ёсьць.

Сьвінарнікі для фэрм будуюцца недапушчальна марудныя тэмпамі. Вытворчыя пляны і дагавары адсутнічаюць. Спэцыяльныя людзі і цягавая сіла для абслугаваньня фэрм ня вылучаны.

Такое становішча стварылася ў выніку бязьдзейнасьці райкалгассаюзу і адсутнасьці ўсякага кіраўніцтва з боку Белкалгассьвінаводцэнтра. Неабходна зараз-жа прыступіць да арганізацыі фэрм. Фэрмы павінны быць арганізаваны не на паперы, а на справе.

Юрка Росны.

Вэрнту пасеўнай

⊙ **Гомель.** Калгасы Гомельскага раёну «Чырвоны Прамень», «Ленінскі Шлях», «Новае Жыцьцё» скончылі сяўбу. Набліжаюцца да выкананьня пасеў плянаў калгасы «Чырвоны Берег», «Бальшавік» і інш.

Калгасы, якія скончылі сяўбу, дапамагаюць адстаючым праводзіць дадатковую сяўбу.

А. Е.

⊙ **Калгас «Іскра», Грушацкага сельсавету** пасьпяхова скончыў сяўбу збожжавага кліну. Засеў збожжавых культур скончан 25-V-31 г., тэхнічных—30-V-31 г.. Узят на грамадзкі буксір адстаючы ў сяўбе калгас «Чырвоны Араты». Арганізавана дапамога ў правядзеньні сяўбы саўгасаў «Каменка». Калгас зараз-жа пасьля пастановы ЦК КП(б)Б уключыўся ў конкурс на лепшае правядзеньне сяўбы і дзякуючы шырокаму разгортваньню сацспаборніцтва і ўдарніцтва дабіўся датэрміновага скончаньня сяўбы, выканаўшы плян сяўбы на 102 проц. Адстаючым калгасам трэба ўзяць прыклад з «Іскры» і на аснове сацспаборніцтва і ўдарніцтва біцца за поўнае выкананьне плянаў сяўбы.

Я. В.

⊙ **Дуброўна. (БЕЛТА).** На 1-га чэрвеня саўгасамі, калгасамі і аднаасобнымі сэктарам засеяна толькі 13.046 га, замест вызначаных па пляну—26.150 га, што складае ўсяго каля 50 проц. вызначанай да засеву плошчы.

На ліквідацыю прарыву павінны быць кінуты ўсе сілы. 2 пяцідзёнкі, якія засталіся да канца сяўбы, павінны зьявіцца рашаючымі ў ліквідацыі прарыву для поўнага скончаньня сяўбы.

⊙ **Карзуноўскі сельсавет,** Сьмілавіцкага раёну ня кіруе разгортваньнем веснавой сяўбы. Некаторым кулаком цьвёрдых заданьняў па сяўбе не дадзена. Старшыня сельсавету Дакура, замест работы, п'янствуе; СКСУ так сама нічога ня робіць. Веснавая сяўба па сельсавеце зрываецца.

Ц-х.

⊙ **Калгас «Свабода», Пухавіцкага** раёну засеяў у фонд Чырвонага Крыжу 3 га і выклікаў пасьледаваць яго прыкладу ўсе саўгасы і калгасы БССР. У калгасе арганізавана ячэйка Чырвонага Крыжу. Калгасьнікі гэтага калгасу зьвярнуліся з адозвай, аб узмацненьні вайсковай і санітарнай падрыхтоўкі, да ўсіх саўгасаў і калгасаў.

Р. С. П.

✦ **Ворша, (наш. кар.). РАД КАЛГАСАЎ АРШАНСКАГА** раёну, якія першымі скончылі сяўбу, ўзялі на буксір адстаючых.

Калгас «Перамога» Кудаеўскага сельсавету скончыў сяўбу 23-га мая. Плян перавыкананы на 20 проц.

Калгасьнікі ўзялі на буксір калгас «Прамень Асьвятленьня» і дапамаглі яму ў сяўбе. Калгас «Ленінскі прызыў» да тэрміну скончыў сяўбу і дапамог скончыць сяўбу калгасу «Прамень сацыялізму».

Калгас «Бальшавік» скончыў сяўбу да тэрміну перавыканаўшы плян на 8 проц. Калгас імя XVI партзьезду» да тэрміну выканаў пасеўплян, і звыш пляну засеяў 1 га аўса ў фонд абароны краіны. Калгас выклікаў пасьледваць яго прыкладу калгасы «Вольная праца» і «Чырвоная ніва».

А. Кудрын.

⊙ **У калгасе «1-га Мая», Хойніцкага** раёну, няма дзіцячых ясьляў ня гледзячы на тое, што для іх маецца работніца, якая скончыла 2-х месячныя курсы Ахматмладу.

У выніку гэтага шмат жанчын у калгасе ня выходзяць на работу, бо ім некуды здаць малых дзяцей. У калгасе-ж маецца вялікі попыт на рабочую сілу. Праўленьню калгасу і адпаведным арганізацыям неабходна безадкладна вырашыць гэтую справу.

Аляксёнак.

⊙ **Калгас «Кастрычнікавая Рэвалюцыя» Заслаўскага раёну,** мае значныя дасягненьні ў галіне будаўніцтва. Калгас пабудаваў абору, стайню, сьвінарнік і іншыя гаспадарчыя будынкі. Гэтае будаўніцтва калгас выканаў за паўтара гады свайго існаваньня.

Гр—н.

⊙ **Бабаўнянскі сельсавет,** Копыльскага раёну ня прымае захадаў, каб опыніць зьнішчэньне маладняка. Нават сам сельсавет патурае гэтаму злачынству. У в. Лавы гр. Нічыпаровіч зарэзаў цялё ў прысутнасьці старшыні сельсавету Марголіна.

Л.

Раённае кіраўніцтва—у баку ад будаўніцтва

Па калгасах Сьмілаўшчыны намечана ў 1931 годзе пабудаваць дзесяткі сьвінарнікаў, кароўнікаў, абор. Да пачатку ўборачнай кампаніі ў радзе калгасаў павінны быць пабудаваны сырабойні і пуні. Тымчасам будаўніцтва ў раёне жывёлагадоўчым мае баявое значэньне, але на гэтае пытаньне да апошняга часу зьвяртаецца вельмі мала ўвагі. Ні адзін з калгасаў будаўніцтва не пачынаў; загатоўленыя матар'ялы ляжаць марна.

У калгасах імя «16 партызан», «Прафінтэрн», «Савецкая Беларусь», Зьвязда», «Чырвоная Зьмена» і інш. не пачата будаўніцтва. Арганізацыі цясьляркіх брыгад нічога ня робяць.

Раённае кіраўніцтва не зварочае ніякай увагі на будаўніцтва па калгасах. РВК лічыць, што будаўніцтва на калгасах не яго справа: «няхай гэтым займаюцца тыя,—кажуць адказныя работнікі РВК,—каму гэта трэба, а мы ўсім займацца ня можам».

Стаўка на самацёк у галіне будаўніцтва павінна быць біта. Трэба зараз-жа прыступіць да будаўніцтва.

Сьмілаўскія арганізацыі павінны забясьпечыць своечасовае выкананьне плянаў будаўніцтва.

Ц. Л.

Краіна патрабуе

неадкладна ўзьняць уверх крывую пасеўнай

У бліжэйшыя дві сяўба яравых павінна быць скончана!

Сяўба на Аршаншчыне разгортваецца марудна

ВОРША (Наш кар.). Згодна пляну сяўба ярыны на Аршаншчыне павінна быць скончана не пазьней 5 чэрвеня.

Але тыя лічбы, якія ёсьць на сёньняшні дзень, паказваюць, што сяўба па Аршанскім раёне разгортваецца недапушчальна марудна. Пасеўныя пляны раёну выкананы калгасамі на 41,7 пр., аднаасобнікамі—на 24,2 проц. і саўгасамі—на 24,8 проц.

Асабліва адстае аднаасобны сэктар. Райвыканкомы і сельсаветы мала зьвяртаюць увагі на аднаасобны сэктар і ня сочаць за тым, як аднаасобныя гаспадаркі выконваюць пасеўныя пляны прынятыя па самаабавязацельству. За можнікі ўхіляюцца ад выкананьня даведзеных цьвёрдых заданьняў па сяўбе.

Сельсаветы ня прымаюць належных мер.

Калгасы «Чырвоны Кастрычнік», Баранскага сельсавету, «Шлях да сацыялізму», імя 12-й гадавіны Чырвонай армії, недапушчальна адстаюць у разгортваньні сяўбы. Яны яшчэ і на 20 проц. ня выканалі пасеўныя пляны. Райкалгассаюз яшчэ амаль нічога не арабіў, каб арганізаваць узаемадапамогу паміж калгасамі.

Але побач з адсталымі калгасамі, мы маем значную большасьць і такіх калгасаў, якія ўжо сяўбу кончаюць, альбо скончылі. Калгасы «Перамога» і «Чырвоны партызан», Кудаеўскага сельсавету сяўбу скончылі па ўдарнаму яшчэ 23 мая. Канчаюць сяўбу таксама і калгасы «Вольная праца», «Авангард», «Плугляй», імя Леніна. Гэтыя перадавыя калгасы дабіліся такіх посьпехаў дзякуючы вядзельшчыне, ліквідацыі абязьлічкі і дзякуючы сацспаборніцтву і ўдарніцтву.

Пасьпяховаму разгортваньню сяўбы ў значнай меры перашкаджае і адсутнасьць ў некаторых калгасах насеньня бульбы, аўсу і вікі. Да такіх калгасаў трэба аднесьці—«Авангард» «Будаўнічы».

Партыйныя арганізацыі Аршанскага раёну, Райза, Райкалгассаюз і сельсаветы павінны зараз-жа з усёй энэргіяй павярнуцца тварам да сяўбы, разгарнуць сацспаборніцтва і ўдарніцтва на палёх, ажыцьцявіць ва ўсіх калгасах вядзельшчыну, падцягнуць адстаючых і прымусіць іх раўняцца па перадавых, мабілізаваць унутраныя рэсурсы каб ліквідаваць недахоп у насеньні.

А. Сёмкін.

Пастанова Праўленьня Калгасцэнтру БССР аб скліканьні усебеларускага зьезду брыгадзіраў-ударнікаў калгасаў

У мэтах падагуленьня вынікаў сацударніцтва ў калгасах і вывучэньня вопыту работы брыгадзіраў—ударнікаў, а таксама ў мэтах далейшага разгортваньня сацударніцтва ў калгасах у час уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы, Праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляе:

1. Склікаць на 1 ліпеня Ўсебеларускі зьезд брыгадзіраў-ударнікаў, якія ў час веснавой сяўбы паказалі сапраўдныя прыклады баявой ударнай работы.

Вопыты ўдарнікаў заводаў, фабрык—у калгасы

Пастанова Праўленьня Калгасцэнтру БССР аб арганізацыі паходу калгаснай моладзі на прадпрыемствы.

У мэтах вывучэньня калгаснай моладзьдзю вопыту сацспаборніцтва і ўдарніцтва, зьдзельшчыны на прадпрыемствах і перанясьненьня гэтага ў калгасы, праўленьне Калгасцэнтру БССР пастанаўляе:

1. Арганізаваць у час паміж вясеньняй пасеўнай і ўборачнай кампаніяй разам з ЦК ЛКСМБ паход калгаснай моладзі БССР на прадпрыемствы, агульнай колькасьцю ў 800 чалавек.

2. У паход вызначаецца тая частка калгаснай моладзі, якая паказала ў час веснавой сяўбы прыклады ўдарнай работы, пры чым кандыдатуры вызначаных у паход абавязкова павінны абгаварвацца на агульных сходах калгаснай моладзі.

Дзесяткі га зямлі пад пагрозай незасеву

Веснавая сяўба па В. Машчаніцкім сельсавеце, Бялыніцкага раёну, праходзіць зусім дрэнна. Пасеўныя пляны аднаасобнікамі ня выконваюцца, а сельсавет да ліквідацыі гэтых недахопаў ня ўжывае належных захадаў. Кулакі вядуць агітацыю супроць выкананьня пасеўных плянаў.

Па замацаваньню калгасаў сельсавет не праводзіць адпаведнай работы.

Так, у в. Забалоцьці арганізаваўся калгас, які пасьля адводу яравога кліну распаўся. Загадчык Чарназерскага лесьпрамгасу, ён-жа сакратар ячэйкі КП(б)Б пры сельсавеце, тав. Сапега, забараніў калгасу араць адведзеную зямлю. Некалькі дзесяткаў га зямлі застаюцца неапрацаванымі. Ня гледзячы на тое, што сяўба ўжо канчаецца, некаторыя аднаасобныя гаспадаркі яе не распачалі і дзесяткі гектараў зямлі застаюцца незасенымі.

Я. Канькоў.

Да адказнасьці

зрыўшчыкаў фінпляну—апартуністаў, абаронцаў кулакоў

Кадзянаўскі, Рудзенскі, Дукорскі, Корзанаўскі сельсаветы ня бачаць кулакоў

Кулацкія падпявалы абараняюць кулакоў

У Сьмілавіцкім раёне выяўленьне кулацкіх гаспадарак пастаўлена дрэнна. Партыйныя і савецкія арганізацыі слаба праводзяць барацьбу з заможна-кулацкімі элемэнтамі і нават не жадаюць гэтым займацца, прымірэнча адносячыся да кулацка-заможнага элемэнту. Паасобныя нават члены РК займаюцца апартуністычнымі разважаньнямі ў гэтым напрамку, што—«нельга крыўдзіць людзей». У час абкладаньня на раёне нагледалася такое зьявішча, што заможныя гаспадаркі скрывалі ад абкладаньня зямлю і аб гэтым ведаў сельсавет, але злачынца маўчаў і гэтым пытаньнем не хацеў займацца.

Па апартуністычнаму адносіліся да гэтай справы, нават стараючыся абараніць кулацкія гаспадаркі. Па раёне яшчэ далёка ня выяўлены ўсе кулацкія і заможныя гаспадаркі, якія ня маюць цьвёрдых заданьняў. Асабліва дрэнна пастаўлена праца ў гэтым напрамку па Кадзянаўскім, Пятровіцкім, Рудзенскім, Дукорскім і інш. сельсаветах, дзе з выяўленьнем кулацка-заможных гаспадарак праца ідзе па самацёку. Па Дукорскім сельсавеце рад заможнікаў утаілі зямлю, і ў сучасны момант утойваюць. Так, заможнік Мазоўка Цярэшка, які эксплёатаваў батракоў, трымаў 20 дзесяцін зямлі, меў 4 коняй, 5 кароў, 40 авечак і інш., у сучасны момант Дукорскі сельсавет далучыў яго да групы беднякоў. Або члены сельсавету в. Дукора сваякі гэтаму заможніку Батурчык Кастусь і Удліцкі сумесна з сакратаром сельсавету Шыдлоўскім Сьцяпанам пры абкладаньні ўтаілі некалькі гектараў зямлі і папалі ў групу беднаты. А Мазоўка Паўлін, сын вядомага заможніка з в. Дукора Мазоўкі Лукаша ўтаіў 3 га зямлі. Цікава тое, што сельсавет добра ведае пра гэтыя справы, але для зьнішчэньня маючыхся недахопаў ня прымае ніякіх мер. Кулак Рак з в. Жораўка цяпер вызвалены ад падатку і прыняты ў калгас, ён нават зьяўляецца старшынёй калгасу. Рак у 1930 годзе «раскулачыўся»: папрадаў коні, насеньне, будову; ён меў 2 батракоў. Рак рабіў усё, каб калгас падарваць. І нават гэты самы Рак Аляксей навучаецца ў Дукорскім вячэрнім калфаку, зьяўляецца сакратаром камсамольскай ячэйкі, якога даўно трэ' было-б выгнаць з калгасу, абкласьці індывідуальна, аддаць пад суд за падрыў калгасу і выгнаць з камсамолу і калфаку. Заможнікі Лявіцкі Каленік, Ярашэўскі Спірыдон, Мазоўка Лукаш утаілі і цяпер па некалькі га зямлі, ня маюць цьвёрдых заданьняў. А кулак Мазоўка Захар утаіў 6 га зямлі, якую арандуе ў п. Засьвятое; кулак Сайчук з в. Дукорка утаіў 3 га зямлі.

Яшчэ горш стаіць справа ў Корзанаўскім сельсавеце, дзе сельсавет зусім згубіў сваю клясавую пільнасьць, паасобныя працаўнікі зжыліся з кулакамі і заможнікамі. Па сельсавеце больш 10 кулацкім гаспадаркам ня даны цьвёрдыя заданьні; яны ўтаілі сваю зямлю. Сельсавет дае такое тлумачэньне: «у нас кулакоў няма». А фактычна толькі ў адной вёсцы Кулюкі ёсьць кулацкія гаспадаркі, не абкладзеныя індывідуальна: Даражок, Юшка, Шыдлоўскі Зьмітрок, якія ўтаілі па 7 га зямлі. Такое самае становішча.

Трэба выявіць усіх кулакоў, якія маюцца ў раёне. Трэба пакараць сурова кулацкіх агентаў—апартуністаў, даць ім рашучы адпор.

Ударнік.

Штурм даў добрыя вынікі

Гомель. (Наш кар.). Скончыўся штурм па ліквідацыі прарываў ў выкананьні фінпляну. Штурм даў прыліў у ашчаджасы 152.000 руб. Плян выкананы на 85 проц. За лепшае правядзеньне фінштурму і перавыкананьне кантрольных лічбаў, штаб па правядзеньні фінштурму высоўвае для прэміяваньня наступныя прадпрыемствы і заводы: «Сельмаш», завод імя Ланцуцкага, «Пралетары», «Камінтэрн», «Праца» і шчацінную фабрыку.

Разам з гэтым штаб адзначае, што на Добрушскай фабрыцы «Герой Працы», запалкавай фабрыцы «Вэзувій» і інш. прарыў у выкананьні фінпляну яшчэ не ліквідаваны.

Штурм выявіў, што апарат ашчаджасаў яшчэ недастаткова перабудаваў сваю работу.

Штурм скончыўся, але работа па ліквідацыі прарыву павінна працягвацца, не паслабляцца ні на хвіліну.

А. Ермакоў.

Стварыць сьвінаводныя таварныя фэрмы

Зусім не выпадкова XVI Зьезд Усе КП(б)Б рашуча пастанавіў фарсіраваць разьвіцьцё сьвінагадоўлі. Сьвінагадоўля, як крыніца мяса і сала, займае адно з першых месц у парахуваньні з іншымі відамі хатняй жывёлы. Дзякуючы надзвычайна высокай пладзіваці сьвіньні—адна сьвіньня ў сваім прыплодзе за год можа даць звыш 1000 кгр. сьвіны ўбойнае вагі. Ад прыплоду-ж буйнае рагатае жывёлы за год магчыма атрымаць толькі каля 65 кгр. (4 пуд) мяса.

Асаблівую каштоўнасьць для даннага моманту набывае хуткасьпеласьць сьвіней і магчымасьць шпаркага адгадаваньня сьвінога стада, пры стварэньні спрыяючых умоў. Гэта відаць з наступных лічбаў: на 1 кгр. прыросту тушы кормнай жывёлы патрэбна харчаваньня: валу—12 кгр., барану—14 кгр. і сьвіньні—4 кгр. Як відаць з прыведзеных лічбаў, на атрыманьне 1 кгр. сьвіны патрэбна ў 3-3,5 разы менш корму, чым на атрыманьне 1 кгр. ялавічыны ці баранчыны. Сьвіньня сапраўды зьяўляецца жывой фабрыкай мяса і сала. Пры належнай пастаноўцы сьвінагадоўлі мы вельмі хутка зможам вырашыць мясную і тлушчавую праблему.

У БССР, як у раёне інтэнсыўнай сьвінагадоўлі, вызначана пашыраная праграма па разгортваньні прамысловае сьвінагадоўлі ў саўгасах і таварных калгасных фэрмах. XIII зьездам КП(б)Б і ўрадам БССР дана цьвёрдая дырэктыва—разгарнуць будаўніцтва сьвінарнікаў і камплектаваньне матачнага стада ў сацыялістычным сэктары сельскае гаспадаркі, маючы на ўвазе, каб на працягу 1931 г. паставіць у саўгасах 75.000 і таварных калгасных фэрмах 150.000 сьвінаматак, давёўшы лік таварных фэрм да 1.300. Заданьне па арганізацыі буйных сьвінагадоўчых саўгасаў і калгасных фэрмаў у БССР складае 20-22 проц. пляну ўсяго Савецкага Саюзу.

Пачынаючы з другой палавы 1930 г. саўгасы і калгасы БССР прыступілі да практычнага ажыцьцяўленьня дырэктыў партыі і ўраду па будаўніцтву сацыялістычнае сьвінагадоўлі. Летась створана база для фарсіраванага разьвіцьця і бязумоўнага выкананьня вытворчых заданьняў па сьвінагадоўлі ў 1931 г.

Да пачатку 1931 г. у саўгасах «Сьвінавода» было пастаўлена 15.700 сьвінаматак і 31.500 сьвінаматак ў калгасных фэрмах. Саўгасы «Сьвінавода» ужо сёлета дадуць 5.000 вытворнікаў палепшанай пароды для мэтызацыі сьвінога стада ў калгасах. Праведзена вялікая работа, асабліва саўгасамі, па выхаваньні кадраў рабочых і калгасьнікаў для непасрэднай работы па сьвінагадоўлі ў буйных сьвінагадоўчых гаспадарках. Саўгасы «Сьвінавода» заваёўваюць перадавыя пазыцыі ў будаўніцтве буйных прамысловасьвінагадоўчых гаспадарак і зьяўляюцца вядучай сілай у адносінах калгасных таварных фэрмаў, перадаючы ім свой арганізацыйна-вытворчы вопыт у будаўніцтве сацыялістычных фабрык мяса. Вопыт работы мінулага году з усёй яскравасьцю паказвае, што вызначаны партыяй шлях сацыялістычнай рэканструкцыі сьвінагадоўлі—шлях будаўніцтва буйных сьвінагадоўчых саўгасаў і калгасных таварных фэрмаў—зьяўляецца адзіна-правільным і поўнасьцю сябе апраўдаў.

1931 г. зьяўляецца рашаючым годам у арганізацыі буйных сьвінагадоўчых саўгасаў і калгасных фэрмаў. Таварная прадукцыя сьвіньні, якую павінны здаць толькі саўгасы «Сьвінавода» і калгасныя таварныя фэрмы на працягу 1931 г. складае 200.000 галоў ці каля 80-85 проц. таварнай прадукцыі сьвіны ўсёй сельскай гаспадаркі за 1928-29 г. Матачнае стада саўгасаў і калгасных фэрмаў, якое будзе пастаўлена ў канцы 1931 года, дае поўную мажлівасьць на працягу 1932 г. атрымаць ад гэтых гаспадарак ня менш 1 000.000 таварных сьвіней, што перавышае ў 3-3,5 разы ўсю таварную прадукцыю сьвіны 1928-29 г.

Вось гэтая вялізарная задача па вырашэньні мясной праблемы, якая стаіць перад саўгасамі «Сьвінавода» і таварнымі калгаснымі фэрмамі патрабуе ад партыйных арганізацый і ўсёй савецкай грамадзкасьці сур'ёзнай увагі да будаўніцтва сьвінагадоўчых гаспадарак. Патрэбна асабліва напружаная работа з боку раённых арганізацый, рабочых саўгасаў, адміністрацыйна-тэхнічнага персаналу і калгасьнікаў, каб выканаць заданьні ў галіне сьвінагадоўлі.

Вылучэньне сьвінагадоўчых таварных фэрмаў праходзіць яўна незадавальняюча. На 20 мая з вызначаных па пляну арганізаваць 1.300 фэрмаў, у якіх павінна знаходзіцца да канца 1931 года 150.000 сьвінаматак—арганізавана толькі 890, з наяўнасьцю 35.560 сьвінаматак. Вылучэньне сьвінагадоўчых фэрмаў выкананa на 70 проц. Гэты факт сьвідчыць аб тым, што на працягу 5 месяцаў Райза і Райкалгассаюз не справіліся нават з задачай вылучэньня сьвінагадоўчых фэрмаў. Да гэтага часу звыш 400 калгасаў ня маюць яшчэ заданьняў па ўкамплектаваньні стада, ня вывезьлі будаўнічых матар'ялаў і ня прыступілі да будаўніцтва сьвінарнікаў.

Асноўнай прычынай усіх прарываў у арганізацыі сьвінагадоўча-таварных фэрмаў зьяўляецца тое, што большасьць раённых арганізацый не паставілі ў цэнтр увагі сваёй работы ажыцьцяўленьне гэтага важнейшага палітычна-гаспадарчага мерапрыемства. Не праведзена належная растлумачальная работа сярод калгасьнікаў і ня мабілізавана грамадзкая думка вакол задач арганізацыі та

Рэвалюцыйны фронт мацнее

Былыя члены сацыял-дэмакратычнай партыі і былыя гітлераўцы парвалі з сацыял-фашыстамі і нац.-фашыстамі і па закліку кампартыі Нямеччыны наладзілі баявую рэвалюцыйную дэманстрацыю

Пастанова

Камісіі выканаўня пры СНК БССР

пра выкананьне пляну сельскагаспадарчага будаўніцтва ў 1930 г. і падрыхтоўку да будаўніцтва ў 1931 г.

Выслухаўшы даклад Народнага Камісара Земляробства тав. Рачыцкага, Камісія Выкананьня пры СНК БССР устанаўлае зусім нездавальняючае выкананьне пляну будаўніцтва (плян па сельскагаспадарчым і жыльлёвым будаўніцтве выканан на 58 проц. і па будаўніцтве індустрыяльных прадпрыемстваў—на 63,9 проц.).

Такі недапушчальна слабы тэмп будаўніцтва сьведчыць аб поўнай безадказнасьці будуючых і будаўнічых арганізацый (Белкалгасцэнтр, Беларуская кантора трэсту «Сьвінавод», Белсельтрэст, Белсадгародсаюз, Беллёнканапляводсаюз, Белхлебжывёлсаюз і Белсельбуд), нятйкасьці іх апэрацыйных апаратаў, нездольнасьці іх прыстасоўвацца да мясцовых умоў і скарыстоўваць мясцовыя рэсурсы і адсутнасьці належнага кіраўніцтва і кантролю з боку НК Земляробства БССР і раённых выканаўчых камітэтаў.

Адзначаючы паказанае, Камісія Выкананьня пры СНК БССР пастанаўляе:

1. Абавязаць Белкалгасцэнтр, пад адказнасьць т. Стрэле, Белсельтрэст, пад адказнасьць т. Грабенчыка, Беллёнканапляводсаюз, пад адказнасьць т. Сарыніча, Белсадгародсаюз, пад адказнасьць т. Панамарова, Бел. Кантору трэсту «Сьвінавод», пад адказнасьць т. Аўчыньнікава, і Белсельбуд, пад адказнасьць т. Сьліўкіна, закончыць пачатае ў 1930 г. будаўніцтва не пазьней наступных тэрмінаў—сельскагаспадарчае і жыльлёвае—да 1-га ліпеня г. г. і індустрыяльнае—1-га верасьня.

2. Прапанаваць Народнаму Камісарыяту Земляробства, пад адказнасьць народнага камісара т. Рачыцкага і загадчыка сэктару індустрыялізацыі і электрыфікацыі т. Арлоўскага, і пералічаныя ў арт. 1 арганізацыі забясьпечыць поўнае выкананьне будаўнічай праграмы па сельскагаспадарчым будаўніцтву ў 1931 г., вызначыўшы каляндарныя тэрміны выкананьня кожнай работы і ўстанавіўшы месячныя і квартальныя справаздачы аб ходзе будаўніцтва.

3. Прапанаваць усім будаўнічым арганізацыям сельскагаспадарчага сэктару і Белсельбуду:

а) тэрмінова выявіць наяўнасьць мясцовых будаматарыялаў у саўгасах і калгасах, з мэтаю поўнага скарыстаньня іх у будаўніцтве 1931 г.;

в) весьці дакладны падлік патрэбных і атрыманых матарыялаў, арганізаваўшы шырокі выраб і загатоўку матэрыялаў на мясцох (каменьне, цэгла, саман, вапна, чарапіца, гонты і піла ваныя матэрыялы) і ўжываньне матэрыялаў мясцовага значэньня (саманныя сьцены, глінагальлёвыя і глінасаломенныя дахі і інш.).

в) забясьпечыць своячасовы падвоз будаўнічых матэрыялаў да месц будаўніцтва;

г) устанавіць дакладны падлік фактычнага кошту будаўніцтва, ужыўшы рашучыя захады да яго патаненьня.

4. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства, будуючым і будаўнічым арганізацыям не дапушчаць ніпляннава будаўніцтва ў 1931 г.

5. Прапанаваць НК Земляробства і раённым выканаўчым камітэтам устанавіць сталы нагляд за ходам сельскагаспадарчага будаўніцтва ў 1931 г.

6. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства прыцягнуць да адказнасьці асоб, вінаватых у зрыве будаўнічай праграмы 1929-30 г.

Нам. Старшыні Камісіі Выкананьня пры СНК БССР **А. Калнін.**
Сакратар Камісіі Выкананьня пры СНК БССР. **Я. Элькін.**
30 мая 1931 г.
г. Менск.

У Прэзыдыуме ЦВК Саюзу ССР

3-га чэрвеня адбылося чарговае пасяджаньне Прэзыдыуму ЦВК СССР пад старшынствам тав. Г. І. Пятроўскага.

Аб зьменах працоўнага законадаўства

Посьпехі сацыялістычнага будаўніцтва ўнесьлі карэнныя зьмены ва ўмовы працы рабочых і служачых у СССР. Беспрацоўе ліквідавана. На пачатку 1931 г. прамысловыя рабочыя ў асноўным ужо пяройдуць з васьмігадзіннага на сямігадзінны рабочы дзень. Матар'яльна-бытавыя ўмовы рабочых паляпшаюцца.

Побач з ільготамі, устаноўленымі ўрадам для работнікаў, якія вызначаліся ў сацыялістычным спаборніцтве, для працуючых доўгі час у адным прадпрыемстве, інжынэрна-тэхнічных работнікаў, пераходзячых з установы на прадпрыемства і г. д. неабходна правядзеньне і раду мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць узьнятае працоўнай дысцыпліны і прадукцыйнасьці працы.

Выходзячы з гэтага, Прэзыдыум ЦВК СССР і Саюзны Саўнарком унеслі ў існуючае заканадаўства аб працы некаторыя зьмены.

Начная зьмена прыраўноўваецца да дзённай па працяжнасьці пры зьменных работах. У прадпрыемствах, пераведзеных на сямігадзінны рабочы дзень, пры зьменных работах за кожную з сямі гадзін начной работы будзе даплачвацца адна сёмая нагадзіннай стаўкі таго разраду, да якога аднесены данны работнік.

Да гэтага часу заработная плата вылачвалася ў рабочы час, цяпер будзе выплачвацца толькі ў нерабочы час. На адміністрацыю ўскладаецца абавязак забясьпечыць такі парадак выплаты, пры якім кожны работнік атрымаў-бы заработную плату без затрыманьня, непасрэдна перад пачаткам работы ці пасьля яе сканчэньня.

За выданую работніку прадпрыемствам ці ўстановай у карыстаньні маёмасьць (спэцвопратка, струменты і г. д.) уводзіцца матар,яльная адказнасьць. Разьмеры гэтай адказнасьці ўстанаўляюцца Наркампрацы СССР па пагоджаньні з УсеЦСПС. Пытаньне аб адказнасьці работніка ў кожным выпадку будзе вырашацца РКК, а пры адсутнасьці згоды—працэсэйнай нарсуда.

У выпадку вытворчай неабходнасьці адміністрацыя можа пераведзьці работнікаў (на тэрмін да 1 месяца) на іншую работу ў тым-жа ці іншым прадпрыемстве і ўстанове той-жа мясцовасьці.

За пераведзеным захоўваецца яго сярэдні заработак па ранейшай работе. Адмаўленьне бяз уважлівых прычын ад такога пераводу будзе лічыцца парушэньнем працоўнай дысцыпліны.

ПА БЕЛАРУСКАЙ ССР

Адзін з 518

Самы буйны элеватар у СССР

ВІЦЕБСК. 4-6. (БЕЛТА). Пры Віцебскім алейным заводзе будуецца самы буйны ў СССР элеватар. Гэтая па будова ёсьць перамога савецкай тэхнікі ў барацьбе за лёзунг «дагнаць і перагнаць». Дыямэтр самага магутнага амэрыканскага элеватару толькі на 20 сантымэтраў шырэй будуемага зараз у Віцебску. 10.000 тон ільнянога семя зьмесьціць элеватар. На пабудове ідзе шпаркая праца ў тры зьмены. Адзін з 518 алейзаводаў з магутным элеватарам ужо ў трэцім рапаючым годзе пяцігодкі дасьць прадукцыю.

За нядбайныя адносіны супроць пажарнай аховы—зьняць з работы

Гомель, (наш. кар.). Загадам старшыні ВСНГ БССР тав. Грысевіча за непрыняцьце адпаведных мер да супроцьпажарнай аховы запалкавай фабрыкі «Везувій» і за дапушчэньне вялікай засьмечанасьці двара фабрыкі розным адкідамі і дрэвасырцом, дырэктару фабрыкі прапанована зьняць з займаемай пасады, загадчыка гаспадаркі т. Рубцова і на начальніка пажарнай аховы т. Бязьдзецкага ўсклясьці адпаведнае спагнаньне.

А. Е.

Ударнымі тэмпамі аднавілі завод

Бабруйск, 5-VI. (БЕЛТА). Дзякуючы магутнаму энтузіязму рабочых чыгуна-ліцейнага заводу імя т. Сталіна, адноўлены ў кароткі тэрмін ліцейны цэх, які быў зьнішчаны пажарам. Рабочыя абавязцілі сябе ўдарнікамі на аднаўленьне заводу і працавалі ў некалькі зьмен. Аднаўленьне заводу скончана за 10 дзён.

Тав. Грысевіч у Гомелі

Гомель. (Наш. кар.). 1-га чэрвеня адбылася нарада трохкутнікаў прадпрыемства Гомлю, на якой з дакладам аб рабоце прамысловасьці выступіў старшыня ВСНГ БССР тав. Грысевіч.

Рабочыя забясьпечаць рэалізацыю пазыкі 3-га рашаючага

Асіпавічы, 6-VI (БЕЛТА). Зьлёт ударнікаў і рабкораў Асіпавіцкага чыгуначнага вузла цалкам ухваляе прапанову электразаводцаў і макееўцаў аб выпуску пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі. Рабочыя торфазаводу «Свабода» і Лесакамбінату патрабуюць ад ураду найхутчэйшага выпуску пазыкі 3-га рашаючага году пяцігодкі.

Патрабаваньне пяці тысяч

Бабруйск, 5-VI (БЕЛТА). Рабочыя і адміністрацыйна-тэхнічны персанал шаўнай фабрыкі і дрэваапрацоўчага камбінату ў ліку 5000 чалавек горача падтрымліваюць прапанову электразводцаў і макееўцаў аб выпуску пазыкі трэцяга рашаючага году пяцігодкі і абяцаюць забясьпечыць пасьпяховае распаўсюджваньне і падпісацца на суму ня менш месячнага заробку.

45.000 руб. на дабрабыт Нова-Барысава

Нова-Барысаў. 5-VI. (БЕЛТА). Для аблягчэньня жыльлёвага крызісу ў Барысаве будуецца 36 кватэрны дом для 60 рабочых сем'яў. Для палепшаньня санітарных умоў, будуецца лазьня, якая будзе абслугоўваць 20.000 чалавек рабочых і працоўных гораду.

На дабрабыт гораду адпушчана 45.000 руб. Прыступлена да забруківаньня вуліц і бліжэйшых да гораду шляхоў. Будаўніцтва рабочай сілай за бясьпечана.

Слухайце па радыё

Панядзелак 8-га чэрвеня

6-00—8-30 Гімнастыка і ранішнія навіны (Трансл. Масквы).
11-00—13-00 Рабочы поўдзень (Трансл. Масквы).
17-00 Пасьляабеднены канцэрт.
18-30 Перадача для піонэраў і школьнікаў.
18-30 Беларуская радыё-газэта са старонкай «Беларускай работніцы і сялянкі».
20-00 Перадача завочнага інстытуту пры ЦК КП(б)Б.
22-00 Перадача на яўрэйскай мове.
22-30 Канцэрт.
23-30 Апошнія навіны і агляд заўтрашняга друку.

Аўторак 9-га чэрвеня.

6-00—8-30 Гімнастыка і ранішнія навіны (Трансл. Масквы).
11-00—13-00 Рабочы поўдзень (Трансл. Масквы).
17-00 Пасьляабеднены канцэрт.
18-00 Палітычная перадача.
18-30 Беларуская радыё-газэта са старонкай калгаснай радыё-газэты.
20-00 Рабоча-калгасны ўнівэрсытэт па радыё.
22-00 Перадача на латыскай мове.
22-30 Канцэрт.
23-30 Апошнія навіны і агляд заўтрашняга друку.

Серада 10-га чэрвеня.

6-00—8-30 Гімнастыка і ранішнія навіны (Трансл. Масквы).
11-00—13-00 Рабочы поўдзень (Трансл. Масквы).
17-00 Пасьляабеднены канцэрт.
18-30 Перадача для піонэраў і школьнікаў.
18-30 Беларуская радыё-газэта са старонкай Чырв. арміі.
20-00 Рабоча-калгасны ўнівэрсытэт па радыё.
22-00 Перадача на мове эсперанто.
22-30 Канцэрт.
23-30 Апошнія навіны і агляд заўтрашняга друку.

Разгарнулі работу

Навасельскі сельсавет, Магілеўскага раёну, шырока разгарнуў агітацыйна-растлумачальную кампанію па папулярызацыі новага закону пра сельскагаспадарчы падатак.

На адбыўшымся апошнім пленуме сельсавету вызначаная норма райвыканкомам па сельсавету прынята і зацьвярджана.

Тут-жа была абрана падатковая камісія. Складзен плян па вучоту аб'ектаў абкладаньня.

Зараз сельсавет, з дапамогай партыйнай і камсамольскай ячэйкі, павінен абгаварыць закон аб сельска-гаспадарчым падатку у кожным паселішчы, асабліва растлумачыўшы ільготы, устаноўленыя для калгасаў.

Модлін.

Ліст у рэдакцыю

Паважаны таварыш рэдактар!

У сувязі з тым, што нейкі Лодысеў разьвіў у сваіх творах яўна контр-рэвалюцыйныя погляды, а наша прэса зусім правільна ацаніла яго гэтыя погляды, не ўказаўшы ініцыялаў Лодысева, некаторыя таварышы і нават установы прыпісваюць яго контр-рэвалюцыйныя погляды мне, Сяргею Лодысеву.

Не жадаючы ні ў якой ступені быць зьмешваемым з контр-рэвалюцыянэрам Лодысевым, я прашу гэтае пісьмо зьмясьціць у друку.

Сяргей Лодысеў.

4 чэрвеня 1931 г.
г. Менск.

У Эканамічным Савеце БССР

На чарговым паседжаньні ЭКАСА, якое адбылося пад старшынством т. Галадзеда, былі разгледжаны наступныя пытаньні (пачатак гл. „Сав. Бел." № 127):

ПРА МЭХАНІЗАЦЫЮ ЛЕСАЗАГАТОВАК І ЛЕСАТРАНСПАРТУ

ЭКАСА заслухаўшы даклад НК РСІ пра мэханізацыю лесазагатовак і лесатранспарту і адзначыў, што дырэктыва аб мэханізацыі лесазагатовак і вывазкі лесу не знайшла належнага адбітку ў рабоце Лесбелу, дзе праца на сёньняшні дзень вядзецца прымітыўнымі мэтадамі. Наглядаецца недаацэнка мэханізацыі з боку Лесбела, лесправгасаў нізавых прафарганізацый, якія ня здолелі мабілізаваць грамадзкасьць вакол гэтае справы. Практычнае кіраўніцтва справай мэханізацыі з боку Лесбела амаль зусім адсутнічала. Пытаньні мэханізацыі ня вынучаны і не распрацаваны, адсутнічаюць канкрэтны плян, вучот становішча і працы мэханізаваных установак, наглядаюцца нядбайныя адносіны да рамонту, да прапрацоўкі ажыцьцяўленьня прапаноў і ў выніку—агіднае становішча мэханізацыі нагсул дыскрэдытуючыя самую ідэю мэханізацыі, мяжуючайся ў паасобных выпадках са шкодніцтвам.

ЭКАСА прапанавала Кіраўніцтву Лесбелу неадкладна прыняць рашучыя крокі для ўпараджаньня і далейшага разьвіцця справы мэханізацыі лесазагатовак і транспарту, а імен на: да 1 чэрвеня склясьці канкрэтны каляндарны плян мерапрыемстваў па мэханізацыі лясной гаспадаркі на 1931 г., прадугледзеўшы ўкараненьне мэханізацыі ў штодзённую практыку і давёўшы гэты плян да паасобных мэханізмаў і рабочых, забясьпечыць укамплектаваньне ячэек мэханізацыі ў трэсьце і на мясцох, а таксама—сыстэматычнае жывое кіраўніцтва і дапамогу мясцом, вызначыўшы спэцыяльных адказных за гэтую справу асоб у лесправгасах і на прадпрыемствах; у дэкадны тэрмін правесьці дакладны вучот усіх мэханізаваных прылад і установак, іх становішча, забясьпечыўшы неабходным рамонтам і наладзіць вучот працы, арганізаваць неадкладна сталыя рабочыя брыгады для працы на мэханізаваных прыладах, забясьпечыўшы адпаведную ўнутраную арганізацыю працы, разгарнуць неадкладна працу па падрыхтоўцы кадраў кваліфікаванае тэхнічнае і рабочае сілы для працы на мэханізаваных прыладах праз арганізацыю спэцыяльных курсаў і шэраг іншых мерапрыемстваў.

Адначасова з гэтым ЭКАСА прапанавала Лясному дасьледчаму інстытуту неадкладна распачаць вывучэньне пытаньня мэханізацыі лясной гаспадаркі.

ЭКАСА яшчэ раз паставіла пытаньне перад Саюзлеспромам аб неабходнасьці большай увагі з яго боку да спраў мэханізацыі лясной гаспадаркі БССР наогул і ў прыватнасьці да пашырэньня колькасных мэханізаваных установак, а таксама да снабжэньня запаснымі часткамі абсталяваньня майстэрань для рамонту трактароў і мэханізмаў, забясьпечаньня рэйкамі вузкакалейных чыгуначных шляхоў і пракладкі палепшаных дарог для вывазкі лесу.

У сувязі з тым, што Саюзлеспром ня гледзячы на неаднаразовыя звароты да яго аб пашырэньні мэханізацыі лясной гаспадаркі па сутнасьці ніякіх мер ў гэтым напрамку ня прыняў, ЭКАСА пастанавіў давесьці аб гэтым да ведама Савету Працы і Абароны.

ЭКАСА лічыць неабходным зьвярнуць увагу ЦП Леодрэў і прапанаваць Лесбелу ўзмацніць працу па ўкараненьні ў масы мэханізацыі лесаразработак і транспарту, па абмену вопытаў, зборы прапаноў у гэтай галіне, па ўкараненьні сацыялістычных мэтадаў працы, брыгаднага мэтаду, ашчадных адносін да мэханізацыі прылад і г. д.

ПРА АРГАНІЗАЦЫЮ Ў БССР МАЙСТЭРНЯЎ ДЛЯ РАМОНТУ РАЧНОГА ФЛЁТУ

У зьвязку з тым, што маючыяся ў БССР майстэрні Дняпроўска-Дзьвінскай Управы рачнога флёту па рамонту паравога і непаравога флёту ні ў якай ступені не задавальняюць патрэбы воднага транспарту БССР у сучасны момант, і маючы на ўвазе перспэктывы разгортваньня дзейнасьці воднага транспарту ў бліжэйшыя гады, ЭКАСА прапанавала Управе Дняпроўска-Дзьвінскага рачнога флёту паставіць пытаньне перад ВОРТ'ам аб водпуску патрэбных крэдытаў на ўкараненьне ў 1931 г. затону і майстэрняў дробнага бягучага рамонту паравога і непаравога флёту ў гор. Магілёве.

Адначасова з гэтым Управе рэчфлёту безадкладна прыступіць да складаньня праектаў гэтага затону і майстэрняў пры ім, а таксама рэйкавага далучэньня для арганізацыі перавалачнага пункту ў мешаных чыгуначна-водных зносін, прадугледзеўшы пры гэтым магчымасьць пашырэньня затону ў рачную гавань, а майстэрняў для капітальнага і эканамічнага рамонту флёту, увязаўшы гэтым праектоўкі з агульным планам рэканструкцыі Дняпра. Гэты праект прадставіць праз Дзяржплан у Эканамічны Савет да 1 чэрвеня 1931 г.

У сувязі з пераносам затону г. Віцебску на новае месца і выкліканым гэтым необходнасьцю пераносу і перабсталяваньня яго майстэрняў, а таксама ўлічваючы патрэбу ў дазабсталяваньні і пашырэньні майстэрняў бягучага дробнага рамонту паравога і непаравога флёту ў Гомлі і Бабруйску, ЭКАСА даручыла Дняпроўска-Дзьвінскай Управе рачнога флёту паставіць пытаньне перад ВОРТ'ам аб дадатковым крэдытаваньні на вышэйпаказаныя работы з тым, каб дадзеныя работы былі скончаны да канца навігацыі 1931 г.

АБ СПЭЦЫЯЛІЗАЦЫІ БРАГІНСКАГА І ХОЙНІЦКАГА РАЁНАЎ У НАПРАМКУ РАЗЬВЯДЗЕНЬНЯ ЦУКРОВЫХ БУРАКОЎ І МЭТАЗГОДНАСЬЦІ ПАБУДОВЫ ЦУКРОВАГА ЗАВОДУ

ЭКАСА лічыць няправільным спробы некаторых работнікаў і ўстаноў зьмяніць рашэньне СНК аб падрыхтоўцы арганізацыі цукровых прадпрыемстваў у Брагінскім і Хойніцкім раёнах без дасканалага дасьледваньня імі гэтага пытаньня.

ЭКАСА адзначыла маруднасьць з боку НК Снабжэньня і НК Земляробства ў справе арганізацыі больш глыбокіх дасьледваньняў пытаньня аб арганізацыі цукровай вытворчасьці і абавязала іх выкарыстаць для гэтага бягучы сэзон з тым, каб у гэтым сэзоне былі арганізаваны досьледы ў заводзкім маштабе.

ПРА ЎСТАНАЎЛЕНЬНЕ ПАРАДКУ ЗАБЯСЬПЕЧАНЬНЯ АСОБНЫМІ ТАВАРАМІ ІНВАЛІДНАЙ КААПЭРАЦЫІ І ДЗЕТКАМІСІІ

ЭКАСА лічыць, што інвалідная каапэрацыя па сваёй дробна-розьнічнай лярковай сетцы і дзеткамісіі па сваіх магазынах павінна працягваць у далейшым гандаль таварамі, у асноўным, недэфіцытнага парадку, як галянтарэйнымі прадметамі, часткова кандыцэрскімі вырабамі, запалкамі, вінамі вырабамі і па лініі інвалідзкай каапэрацыі папяросамі.

ЭКАСА лічыць неабходным з агульнага кантынгенту трыкатажных вырабаў, якія вытвараюцца сампрамкаапэрацыяй БССР выдзяліць да 7 пр. з тым, каб яны былі перададзены для рэалізацыі па розьнічнай сеці інвалідзкай каапэрацыі; акрамя таго ЭКАСА лічыць абавязковым, каб дэфіцытныя прадметы, якія рэалізуюцца па лініі розьнічнай сеці інвалідзкай каапэрацыі, як: папросы, трыкатаж і інш. адпускаліся па захоўваньні агульнага парадку водпуску гэтых дэфіцытных прадметаў з неабходнай адзнакай у адпаведных наборных дакумэнтах па ўзгадненьні з ЦРК пад наглядам інспэктараў гандлю. Белкавэнсаюзу прапанавана ўстанавіць па ўзгадненьні з НК Снабам асартымэнт і парадак водпуску недэфіцытных тавараў для забясьпечаньня розьнічнай лярковай сеткі інвалідзкай каапэрацыі і магазынаў дзеткамісій.

У сувязі з тым, што саматужны трыкатаж у гэтым годзе поўнасьцю плянуецца ў цэнтралізаваным парадку і ўвесь трыкатаж, які вырабляецца па лініі сампрамсаюзу ў Беларусі ўлічваецца ў агульным плане заводу ў БССР і што ў параўнаньні з мінулым годам ў значнай меры скараціўся фонд забясьпечаньня арганізаванага спажыўца трыкатажам, ЭКАСА лічыць, што далейшы гандаль па лініі дзеткамісій трыкатажам павінен быць спынен і ніякіх фондаў для гэтай мэты не выдзяляць, а па інвалідзкай каапэрацыі выдзяліць ня больш 7 проц.

ПАПРАЎКА

У газ. «С. Б.» за 5-VI г. г. у пастанове калегіі Наркамасьветы ўкралася недарэчнасьць.

У п. 2 пастановы надрукавана: ...«уключыцца ўсім культэстафэтным установам у рэйд брыгад», а трэба: ...«усім культпалітасьветным установам».

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

ЦЫРК-КІНО-ТЭАТР

Дзяржцырк	СЁНЬНЯ **ВЯЛІКІ ДНЯУНЫ ПАКАЗ** Група дрэсіраваных вярблюдаў. Пач. а 2 гадз. дня. УВЕЧАРЫ **ВЯЛІКІ ЦЫРКАВЫ ПАКАЗ** Група дрэсіраваных вярблюдаў пад кір. прас. **Лапіада** і шмат інш. №№ жывотных. Пачат. а 8 ч. 45 х. увечары. Льготныя білеты ў рабкасе
„Чырвоная Зорка"	Амэр. прыгодн. фільм **ЛЯГУНА ПЭРЛАЎ** Кіно-хроніка Саюзкіно № 26. Пач. а 7, 8 45, 10 30 г. Каса адч. з 5 гадз.
Кіно-тэатр „Культура"	Новы фільм **Чалавек за бартом** Драма ў 6 частках. Звыш праграмы кіно-хроніка Саюзкіно. Пачатак а 7 гадз. Каса адч. з 5 г.
Кіно „Інтэрнацыянал"	Амэрыканскі фільм **Небаскроб** Пачатак сэансаў а 7 гадз.
Кіно „Пралетары"	2 фільмы ў адзін сэанс. 1. **ДОМ НА ТРУБНОЙ** у 6 частках. 2. **РАДЫЁ І ЛЕЎ** у 6 частках. Пачатак I сэансу а 2 г. дня

ДЭКАНАТ ПЭДФАКУ

АБВЯШЧАЕ ВАСЕНЬНІ НАБОР

НА ВЯЧЭРНІ ПЭДФАК

на якім будуць адкрыты аддзяленьні:

Літаратурна лінгвістычнае—30 асоб
Сацыяльна-гістарычнае—30 асоб
Прыродазнаўчае—30 асоб

Студэнты вячэрняга пэдфаку ні інтэрнатам, ні стыпэндыяй не забясьпечваюцца.

Прыём заяў на вячэрні пэдфак працягваецца да 15 жніўня.

Аб тэрміну іспытаў і пачатку заняткаў будзе паведамлена асобна. Заявы прымаюцца ў канцэляры пэдфаку (Унівэрсытэцкі Гарадок, Прыродазнаўчы Корпус), ад 10—2 гадзін.

Правілы прыёму на вячэрні пэдфак тыя ж, што і на дзённы.

Дэкан пэдфаку РУДНІЦКІ

КОШТ публікацыі аб згубе 1 дакумэнту **1 р.**

У выкананьне пастановы Наркамснабу БССР ад 14-II-31 г. за № 9,

Беларуска-Заходнім аддзяленьнем Саюзтара

арганізаваны РАМОНТНА-ТАРНЫЯ БАЗЫ

па рэгенэрацыі (рамонце) мяшкоў па ўсіх гарадох Беларусі.

Таму на падставе заключаных генэральных умоў паміж Саюзтарай з непасрэднымі гаспадарамі мяшкоў, як: Саюзхлебам, Саюзцукрам, Белплодагароднінай і БКС, ПРАПАНУЕЦЦА неадкладна ўсім трымальнікам усіх відаў мяшкоў гаспадарчым, дзяржаўным, каапэратыўным, саўгасным і калгасным арганізацыям ўсю сваю запазычанасьць мяшкоў і пры плянавым завозе адразу пасьля апаражненьня **ЗДАЦЬ** на рамонтна-тарныя базы Саюзтара, якія прымаюць па раёнаў дзейнасьці атрымальніка, згодна наступнага сьпіску раёнаў дзейнасьці баз:

I. Менская база
1. Койданаўскі раён
2. Узьдзенскі „
3. Пухавіцкі „
4. Лагойскі „
5. Смалявіцкі „
6. Самахвалавіцкі „
7. Сьмілавіцкі „
8. Чэрвеньскі „
9. Заслаўскі „
10. Копыльскі „
11. Грэскі „

II. Віцебская база
1. Віцебскі раён
2. Высачанскі „
3. Лёзьненскі „
4. Сенненскі „
5. Суражскі „
6. Бешанковіцкі „
7. Чашніцкі „
8. Гарадокскі „
9. Межанскі „
10. Шумілінскі „

III. Гомельская база
1. Гомельскі раён
2. Уваравіцкі „
3. Тэ эхаўскі „
4. Веткаўскі „
5. Чэчэрскі „
6. Рэчыцкі „
7. Брагінскі „
8. Лоеўскі „
9. Камарынскі „
10. Буда-Кашалёўскі „
11. Хойніцкі „

IV. Бабруйская база
1. Бабруйскі раён
2. Глускі „
3. Рагачэўскі „
4. Парыцкі „
5. Жлобінскі „
6. Клічэўскі „
7. Сьвіслацкі „
8. Асіповіцкі „
9. Чырв.-Слабодзкі „
10. Любаньскі „
11. Ст.-Дароскі „
12. Слуцкі „
13. Старобінскі „

V. Магілеўская база
1. Белыніцкі раён
2. Быхаўскі „
3. Журавічацкі „
4. Кармянскі „
5. Клічаўскі „
6. Чырв.-Польскі „
7. Касьцюкавічаўскі „
8. Клімавіцкі „
9. Магілеўскі „
10. Лупалоўскі „
11. Прапойскі „
12. Хвойнскі „
13. Чэрыкаўскі „
14. Шклоўскі „
15. Чаўскі „
16. Чэчэвіцкі „

VI Барысаўская база
1. Барысаўскі раён
2. Бярэзінскі „
3. Халопенічскі „
4. Бегамольскі „
5. Плешчаніцкі „

VII Аршанская база
1. Аршанскі раён
2. Багушэўскі „
3. Горэцкі „
4. Дубр венскі „
5. Дрыбі скі „
6. Каханоўскі „
7. Круг явскі „
8. Ледянянскі „
9. Копыскі „
10. Крупскі „
11. Мсьц'слаўскі „
12. Чэрэйскі „
13. Расьнянскі „
14. Талочынскі „

VIII. Полацкая база
1. Полацкі раён
2. Ра онскі „
3. Ушачскі „
4. Ульскі „
5. Борковічаскі „
6. Ветрывскі „
7. Лепельскі „
8. Дрысенскі „
9. Асьвейскі „

ЗА НЕСВАЯЧАСОВУЮ ЗДАЧУ МЯШКОЎ ТРЫМАЛЬНІКІ БУДУЦЬ ШТРАФАВАЦЦА Ў 5-РАЗОВЫМ РАЗЬМЕРЫ,

згодна пастановы Наркамснабу СССР ад 22-IV—1931 г.

УВАГА: Штраф не вызваляе трымальніка ад своячасовай здачы мяшкоў, якія за ім лічацца, ва ўстаноўленыя Наркамснабам СССР тэрміны.

КІРАЎНІЦТВА „САЮЗТАРА"

ДЗЯРЖАЎНЫ АРБІТРАЖ пры СНК БССР

ДАВОДЗІЦЬ ДА ВЕДАМА

ўсіх установаў, прадпрыемстваў і арганізацый аграмаджанага сэктару, што пры падачы ў дзяржарбітраж іскавых заяў

ЯНЫ ПАВІННЫ АПЛАЧВАЦЦА АДЗІНАЮ ДЗЯРЖАЎНАЮ ПОШЛІНАЮ Ў РАЗЬМЕРЫ 2 ПРОЦ. АД ЦАНЫ ІСКУ,

пры чым грошы ўносяцца ў мясцовае аддзяленьне дзяржбанку, а копія квітка аб прыёме грошай банкам разам з іскавою заявою падаецца ў дзяржарбітраж.

Іскавыя заявы і ўсе дакумэнты падаюцца з копіямі па ліку ўдзельнікаў другой стараны

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара—7-69, сакратара—4-78, сэкратараў—6-15. Выдавецтва—2-44
падпісная плата: 1 месяц—90 к., 3 м-цы—2,70, 6 м-цаў—4,00, на год—8,00.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.